ПРАЛЕТАРЫ ВСЯГО СВЕТУ, САЕДНАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

№ 149 (3257) Серада, 3-га ліпеня 1929 г.

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў Камуністычнай Партыі (б) Беларусі.

Адрас рэд. і канторы: Менск, Савецкая, 63
ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА, ГОД ВЫДАНЬНЯ XIII
Тэлефоны: рэдактар—1074, сакратар—619, кантора—781

РАДЫЯ ПРА ГРАНІЦУ ПРАЦУ ПАД ЛЕЗУНГАМІ:

ЛЁНДАН, 2. Лібэральны орган «Манчэстэр Гардыян», разглядаючы тронную прамову, адзначае чуткі пра магчымае адтаўлёнаваньне ў аднаўленьні ангельска-савецкіх адносін. Газэта заяўляе, што ў гэтым пытаньні ня могуць узьнікнуць ніякія перашкоды, калі толькі рабочы ўрад не паспрабуе патрабаваць якое-небудзь платы за тую справу, якую ён абавязан выканаць, як паводле патрабаваньня грамадзкае думкі, так і ў сваіх уласных інтарэсах

ЛЕНІНСКІЯ НАВІНЫ Б. С. С. Р.

На бесьперапынны рабочы тыдзень

ГОМЕЛЬ. (Наш кар.). Прафактыў фабрыкі „Вэзуві“ выказаўся за пераход на бесьперапынны рабочы тыдзень і даручыў заводакіраўніцтву разам з вытворчай камісіяй ажыцьцявіць гэты пераход

Працэс „фабрыкантаў“ антысавецкіх фальшывак

Белагвардзейцы на ўтрыманьні нямецкага ўраду

БЭРЛІН, 1. Пачаўся працэс Арлова і яго супольнікаў. Абвінавачэньні акт зазначае, што падсудныя падраблялі дакументы, праследуючы мэту матар'яльнае нажывы. Фальшыўкі яны прабавалі збываць амэрыканскаму журналістаму Нікербэкеру і Гарольду Зівэрту (былому царскаму афіцэру і супрацоўніку Бэрлінскае палітычнае паліцыі).

Абаронцы абвінавачаных імкнуцца паказаць іх дзейнасьць, як вынік «ідэалістычных» настроеў, вынікаючых з фанатычнае нянавісьці абвінавачаных да савецкага ладу. Абаронца Арлова падкрэсьлівае, што Арлоў сыстэматычна забясьпечваў асьведамляючым матэрыялам нямецкія дзяржаўныя ўстановы, прычым, неасьцярожна ўспамінае пра так званы ліст Зіноўева. **У якасьці асьвядомцы нямецкіх дзяржустаноў Паўлаўноўскі атрымліваў нават пэўную месячную пэнсію.**

Пры асабістым допыце Паўлаўноўскі заяўляе, што пасьля Кастрычнікавае рэвалюцыі, ён нібы супрацоўнічаў у ДПУ і адправіў за граніцу рад дакументаў, кіруючыся інтарэсамі белагвардзейскага руху. Паўлаўноўскі заяўляе, быццам яго сапраўднае прозьвішча Карнаў, а ў ДПУ ён працаваў пад прозьвішчам Якшын і атрымаў камандыроўку заграніцу з дыплёматычным пашпартам на імя Сумарокава. Нямецкія ўлады пасьля таго, як ён пакінуў савецкую работу, выдалі яму афіцыйны пашпарт на імя Паўлаўноўскага.

Арлоў з гонарам расказвае аб сваёй дзейнасьці ў якасьці сьледчага і пракурора ў царскі час. Пасьля Кастрычніка Арлоў над прозьвішчам Арлінскага працаваў у Наркамюсьце, абслугоўваючы увесь час белагвардзейцаў. Пры гэтым ён падтрымліваў самыя блізкія зносіны з нямецкім консулам Бартэльсам, якому дастаўляў рад сакрэтных матар'ялаў з наркамату юстыцыі. У кастрычніку 1918 году Арлоў атрымаў з нямецкага консульства два пашпарты з якімі ўцёк у Адэсу, дзе працаваў у якасьці начальніка контр-разьведкі. Апынуўшыся за граніцаю, Арлоў па даручэньні Ўрангеля, вёў нагляд «за бальшавіцкай работай» за граніцаю.

Спробы Арлова падрабязна спыніцца на «бальшавіцкіх інтрыгах» нібы існуючай савецка-шпіёнскай арганізацыі спыняецца заўвагаю старшыні, што суд павінен расьсьледаваць толькі факт продажу фальшывых дакументаў, усё-ж іншае тут ня мае месца.

Пры разглядзе трох дакументаў, якія Паўлаўноўскі хацеў прадаць Нікербэкеру і якія дакраналіся мнімага подкупу Бора, выкрываюцца грубейшыя супярэчнасьці ў паказаньнях абвінавачаных, што часамі выклікае сьмех ў залі суду. З поваду фальшыўкі, нібы «інструкцыі ДПУ», Арлоў сьцьвярджае, што дакумант аўтэнтычны. Паводле слоў Арлова, ён сфальсыфікаваў толькі некалькі радкоў, каб такім чынам гэты дакумант зьвязаць з імем сэнатара Бора. Сваю чыннасьць Арлоў зараз тлумачыць тым, што ён, нібы, прабаваў расшыфраваць сувязь гэтага дакументу з Бора, на што яму паказаў Паўлаўноўскі. Гэта сьцьверджаньне абвяргаецца фатаграфіяй шыфру, якая знаходзіцца ў руках суду. Арлоў даў гэту фатаграфію Паўлаўноўскаму, якая як паказаў Паўлаўноўскі на паліцэйскім допыце, была зроблена спэцыяльна з гэтым дакумантам. Арлоў заявіў, што гэты шыфр «толькі практыка».

Усе імкненьні паказаць падробнікаў фальшывак, як «ідэалістых», разьбіваюцца пасьля таго, становіцца вядомым, што яны патрабавалі за тры дакументы 1.000 даляраў, а за наступныя дакументы яшчэ 1.000 даляраў. Паўлаўноўскі сьцьвярджае, што ліст Нікербэкеру яму прадыктаваў Арлоў. Арлоў ад гэтага адмаўляецца. Асобную ролю на працэсе адыгрывае кіраўнік агэнцтва «Пост Экспрэс»—фон-Фос, які выступае ў якасьці генэральнага экспэрта па справах фальшывак, у якасьці перакладчыка і звыш-штатнага «ганаровага абаронцы».

Блытаніна ў паказаньнях падсудных

БЭРЛІН, 1. На дзённым паседжаньні суду абгаварваецца пытаньне аб фальшывых дакумантах, праданых Зівэрту. Асноўны тэзіс абароны, быццам абвінавачаныя дзейнічалі з «чыста ідэёвых» замераў, церпіць поўнае наражэньне. Усё абгаварэньне пытаньня сканцэнтравалася на гранах і плацяжох. Абвінавачаньне сьцьвярджае, што Паўлаўноўскі разам з Арловым перадалі Зівэрту больш 20 фальшывых лістоў ДПУ, з якіх некаторыя дакраналіся нямецкага камісарыяту грамадзкага парадку.

На паліцэйскім допыце Паўлаўноўскі прызнаў, што ён разам з Арловым сфабрыкаваў усе лісты. Пасьля таго, аднак, Паўлаўноўскі зьмяніў сваю пазіцыю і пачаў заяўляць, што частка лістоў сапраўдныя. На сёньняшнім паседжаньні Паўлаўноўскі ўжо заявіў, што ўсе лісты сапраўдныя. Толькі ў адносінах 8 лістоў, якія зьяўляюцца якраз прадметам абгаварэньня на судзе, Паўлаўноўскі ня зусім упэўнена сьцьвярджае, што яны сапраўдныя. Абаронца Паўлаўноўскага ў якасьці доваду сапраўднасьці, прынамсі, лістоў ДПУ, расказвае фантастычную гісторыю, быццам у час працэсу нямецкіх фашыстых студэнтаў у Маскве, дарадца савецкага пасольства ў Бэрліне Брадоцкі прызнаў сапраўднасьць аднаго лісту ДПУ і на гэтай падставе нібы, пасьледвала паміляваньне студэнтаў.

У процівагу гэтаму, старшыня суду зачытвае ліст Паўлаўноўскага, у якім зазначаецца, што ўсе лісты зьяўляюцца фальшывымі. Паўлаўноўскі ў сваю чаргу заяўляе, быццам напісаць гэты ліст прымусіў яго Зівэрт.

Нямецкі друк аб працэсе Арлова

БЭРЛІН, 2. Камэнтары друку аб першым дні працэсу фабрыкатараў фальшывак Арлова і Паўлаўноўскага надзвычайна няспрыяючыя для падсудных. Усе газэты пачынаючы з сацыял-дэмакратычнае «Форвэртс» і канчаючы крайне правымі, падкрэсьліваюць нярэнтуёнасьць аргумэнтаў абвінавачаных, якімі яны стараюцца замазаць справу. «Форвэртс» публікуе паведамленьне аб паседжаньні суду пад загалоўкам «Сьмяцьцёвая яма палітычнае інфармацыі». «Фосішэ-Цайтунг» падае паказаньні абвінавачаных і, асабліва, Арлова, з надзвычайна рэзкімі камэнтарамі. Нават нацыяналісцкія газэты фашысцкага толку адкрыта ігнаруюць над «патрыётычнымі» матывамі фабрыкантаў фальшывак і падкрэсьліваюць, ... Арлоўская банда шкодзіла інтарэсам Нямеччыны. Газэты бяз усякіх камэнтараў зьмяшчаюць цьвярджаньні Паўлаўноўскага, што ён атрымліваў штомесячную ўзнагароду ў разьмеры 450 марак са сродкаў нямецкага камісарыяту грамадзкага парадку і апрача таго, штомесячна 200 марак са сродкаў бэрлінскага паліцэйпрэзыдыуму праз Зівэрта. Водгукі друку паказваюць, што тактыка падсудных і абароны, якая заключалася ў спробе зрабіць нацiск на суд і на грамадзкую думку цьвёрдым падкрэсьліваньнем сувязі падсудных з нямецкімі дзяржаўнымі ўстановамі, пакуль не дала ніякіх вынікаў.

Арлоў выкрывае

Ужо першы дзень судовага працэсу выкрыў усю глыбіню тэй агіднай зграі, якую ўяўляе сабою банда Арлова і яго міжнародных прыяцеляў. Паводле заявы самога Арлова, Паўлаўноўскага і іх абаронцаў, гэта банда знаходзілася ў самай цеснай сувязі з нямецкімі асьведамляючымі і паліцэйскімі ўстановамі. Праз нямецкага консула Бартэльса ў Ленінградзе ў 1918 годзе да цяперашніх устаноў прускае паліцыі і грамадзкай бэзапаснасьці цягнуцца ніткі Арловых і іншых дзеячоў расійскай белагвардзейшчыны. Ня дзіва, што папярэдняе сьледзтва ў Бэрлінскім паліцэй-прэзыдыуме ... надзвычайна павольна, што там усяляк стараліся звузіць межы сьледзтва і што толькі пад націскам грамадзкае думкі і выкрыцьцяў у друку і рэйхстагу, гэтыя межы пашыраліся і разгортваліся новыя бакі працэсу. **Выкрыцьцё самімі абвінавачанымі сувязі расійскіх манархістых, удзельнікаў тэрарыстычных арганізацый і белагвардзейскіх контразьведак з «сацыялістычнай» паліцыяй Прусіі,** зьяўляецца тым яскравым месцам на ўсім малюнку мастацтва Арлова, якое прымушае савецкую грамадзкую думку быць асабліва напагатове. Мы чакаем ад бэрлінскага суду, што ён да канца выкрые ўвесь гэты гнайнік і пакарае аднаведна заслугам усіх міжнародных злачынцаў.

(«Правда»).

АДКРЫУСЯ УСЕБЕЛАРУСКІ ЗЬЕЗД ПРАЦОУНЫХ ПАЛЯКАУ

Дзесяткі тысяч працоўных палякаў удзельнічалі ў выбарах на зьезд

ЗЬЕЗД ПАЧАЎ ПРАЦУ ПАД ЛЕЗУНГАМІ:

ТОЛЬКІ У КРАІНЕ САВЕТАЎ ЗЬДЗЕЙСЬНЕНА САПРАЎДЫ БРАЦКАЕ ЯДНАНЬНЕ НАЦЫЯНАЛЬНАСЬЦЯЙ!

Супроць фальшывай „еднасьці народаў“—за клясавае аб'яднаньне працоўных

Прэч буржуазную хлусьню аб СССР!

Дэлегаты па дарозе ў залю пасяджэньняў зьезду (польскі клюб імя Розы Люксэмбург)

Учора ў клюбе імя Розы Люксэмбург адкрыўся ўсебеларускі зьезд працоўных палякаў па выбару дэлегатаў на варшаўскі зьезд палякаў, што жывуць па-за межамі Польшчы. На зьезд прыехалі 116 дэлегатаў ад усіх округ БССР. Зьезд адкрывае ад імя цэнтральнага грамадзкага камітэту Беларусі тав. Чэрвонка.

Выбары прэзыдыуму зьезду

У прэзыдыум зьезду, згодна прапановы Менскай, Віцебскай і Бабруйскай дэлегацый абіраюцца ў складзе 9 чал. наступныя таварышы: Чэрвонко—старшыня грамадзкага камітэту, Клыс, Віслаух, старшыня польскага калектыву імя Дзяржынскага ў Мазыры, Майхровіч—рабочы заводу «Кастрычнік», Маліпшэўская—настаўніца, Еўневіч—сялянка Аршанскай акр., Мажэйка—работніца фабрыкі «Дзьвіна», Мысьлінскі—БелАПП і Кляванскі— селянін Полацк. акр.

У ганаровы прэзыдыум абіраюцца т. т. Сталін, Калінін, Рыкаў, Варашылаў, Гамарнік, Васілевіч, Чарвякоў, Славінскі, Галадзед.

Зьезд пастанавіў паслаць прывітальныя тэлеграмы ЦВК і СНК БССР, ЦК КП(б)В.

Прыстаньні зьезду

Ад імя сельска-гаспадарчых рабочых Койданаўскага раёну зьезд вітаюць т. т. **Ідус і Робэк.**

— Таварышы дэлегаты! Дазвольце ад імя сельскагаспадарчых рабочых і пастухоў палякаў Койданаўскага раёну вітаць ваш зьезд. Да вушэй пастухоў дайшлі чуткі, што у Варшаве зьбіраецца зьезд палякаў. Мы радуемся, што зьезд арганізуецца не працоўнымі, а буржуазіяй. Таварышы дэлегаты, вы павінны сказаць на зьезьдзе праўду пра тыя дасягненьні, якія мы маем на культурным і гаспадарчым фронце. Выкрыйце польскую буржуазію, скажэце, што польскі працоўны народ, які жыве на тэрыторыі Савецкай Беларусі, будуе сацыялістычую гаспадарку ў сваёй сацыялісіт. бацькаўшчыне—БССР.

Тав. Робэк падносіць зьезду падарак —трубу пастухоў і кажа:

— Няхай гэта труба будзіць працоўных усяго сьвету супроць капіталістых.

Зьезд вітае дэлегат цэнтральных настаўніцкіх курсаў, які кажа:

— Ад імя польскіх настаўнікаў дазвольце заявіць, што працоўныя, якія будуюць сацыялістычную гаспадарку ў СССР, заўсёды знойдуць апору ў аблічы польскай працоўнай савецкай інтэлігенцыі. Разам з рабочымі і сялянамі працоўная інтэлігенцыя пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі будзе ўдзельнічаць у сацыялістычным будаўніцтве, садзейнічаць культурнаму разьвіцьцю мас і змагацца са спадчынай мінулага—цемраю. Працоўная інтэлігенцыя просіць дэлегатаў, што будуць абраны, перадаць прыгнечаным народнасьцям Польшчы прывітаньне ад працоўных палякаў, ад працоўнай польскай інтэлігенцыі.

Няхай жыве адзінства працоўных мас усіх нацыянальнасьцяй!

Тав. **Клеманскі** ад імя Полацкае дэлегацыі вітае зьезд і кажа, што польскія рабочыя і сяляне ідуць нага ў нагу з працоўнымі і сялянамі іншых нацыянальнасьцяй СССР у справе будаўніцтва сацыялізму.

запаўняюць анкеты

Ад імя польскага сэктару Беларускай Акадэміі Навук, зьезд вітае т. **Віткоўскі,** які зазначае на вялізьнейшыя дасягненьні ў галіне культурнае заваёвы палякаў у БССР. Ужо восьць цэлы рад польскіх навуковых устаноў, якія рыхтуюць дзеячоў польскае пралетарскае культуры.

Рабочы, які вітаў зьезд ад імя рабочых-палякаў фабрыкі **«Камунар»,** кажа: «мы, рабочыя, упэўнены, што зьезд абярэ такіх дэлегатаў, якія скажуць праўду пра СССР». Ад імя рабочых-**беларусаў** тэй-жа фабрыкі, выступаўшы таварыш адзначыў, што дэлегаты, якія будуць абраны зьездам, павінны выкрыць усю тую хлусьню, якую выліваюць на СССР буржуазія і яе наймёты сацыял-згодніки —пэпэсэсаўцы.

Далей зьезд заслухаў справаздачу цэнтральнага грамадзкага камітэту Беларусі, якую зрабіў т. **Чэрвонка.**

Працоўныя палякі БССР пасылаюць дэлегатаў на зьезд у Варшаву, каб расказаць аб вялізных дасягненьнях польскіх працоўных мас у краіне саветаў

З дакладу т. Чэрвонка

Зусім згаджаючыся з адозваю «Оркі», каб польскае насельніцтва БССР прыняло ўдзел у варшаўскім зьезьдзе, на падставе афіцыйнага запрашэньня варшаўскага арганізацыйнага камітэту, які прыслаў у лістападзе 1926 г. гэта запрашэньне ў газэту «Млот», Усебеларускі грамадзкі камітэт, згодна рэзалюцыі грамадзкіх польскіх арганізацый БССР, а таксама, згодна сходаў працоўных палякаў, прыступіў да арганізацыі ўсебеларускага зьезду працоўных палякаў для выбараў дэлегацыі.

Усебеларускі грамадзкі камітэт паслаў тэлеграфнае паведамленьне ў варшаўскі камітэт аб выбарах дэлегацыі на варшаўскі зьезд і ад працоўнага польскага насельніцтва Беларусі з просьбаю аб высылцы ўсякіх матар'ялаў, якія датычаць варшаўскага зьезду, а таксама і віз на выезд у Польшчу. Аднак, ніякага адказу да гэтага часу не атрымана.

Усебеларускі грамадзкі камітэт у сваёй работе кіраваўся заданьнем, каб **да выбарчай кампаніі прыцягнуць самыя шырокія масы працоўных палякаў і растлумачыць ім значэньне і мэты варшаўскага зьезду.** Камітэт у далейшай сваёй дзейнасьці ухваліў, што выбіраць і быць абраным на зьезд у якасьці дэлегатаў ад польскага працоўнага насельніцтва маюць права толькі тыя, хто карыстаецца поўнымі правамі савецкай канстытуцыі.

На падставе таго дзесяткі тысяч працоўных палякаў прынялі надзвычайна жывы ўдзел у сходах і выбарах, аб чым сьведчаць наступныя лічбы: У Менскай акрузе адбыліся сходы ў 75 выбарчых пунктах пры ўдзеле некалькіх тысяч прысутных і выбарах 134 дэлегатаў на акруговую канфэрэнцыю. У Полацкай акрузе адбыліся сходы ў 24 пунктах, дзе абрана 54 дэлегаты на акруговую канфэрэнцыю; у Мозыры, у 18 пунктах —67 дэлегатаў, у Воршы—у 23 пунктах, 56 дэлегатаў, у Гомельскай акрузе ў 30 выбарчых пунктах—60 дэлегатаў, Бабруйск — 26 пунктаў,—62 дэлегаты; Віцебск — 16 пунктаў — 50 дэлегатаў, Магілеў — 21 пункт, — 50 дэлегатаў. Усяго па Беларусі на 233 выбарчых пунктах было абрана 412 дэлегатаў на акруговыя канфэрэнцыі. Для сваёй штодзённай працы камітэт атрымаў ад праўленьня клюбу імя Розы Люксэмбург адзін пакой гэтага клюбу. Усебеларускі грамадзкі камітэт з мэтаю пасылкі дэлегацыі зьвярнуўся да працоўных палякаў і ўсіх грамадзкіх арганізацый і акруговых грамадзкіх камітэтаў з прапановаю збору сродкаў на гэту мэту як па падпісных лістох, так і шляхам наладжаньня вечароў у клюбах, хатах-чытальнях і іншых культурна-асьветных установах.

На заклік камітэту аб зборы сродкаў для дэлегацыі на выезд у Варшаву, працоўнае польскае насельніцтва БССР адгукнулася тысячамі подпісаў на падпісных лістох; так, напрыклад, рабочыя-палякі Менскае электрычнае станцыі сабралі 161 руб., рабочыя-палякі фабрыкі «Кастрычнік» 150 руб. і г. д. Ня гледзячы на тое, што збор сродкаў яшчэ ня скончан, на гэты час сабрана праз акруговыя камітэты на адрас усебеларускага грамадзкага камітэту ўжо 8.157 руб. 17 к.

Аб настроях і адносінах да варшаўскага зьезду з боку працоўных палякаў БССР яскрава сьведчаць рэзалюцыі і наказы, якія былі прыняты на выбарных сходах і акруговых канфэрэнцыях.

Дэлегаты атрымоўваюць мандаты

Працоўныя палякі ня прызнаюць фашысцкае Польшчы за сваю бацькаўшчыну, яны сьцьвярджаюць, што адзінай сваёй бацькаўшчынай яны лічаць СССР, дзе разам з іншымі нацыянальнасьцямі будуюць сацыялізм.

Працоўныя палякі БССР пасылаюць дэлегатаў на варшаўскі зьезд для таго, каб яны дэманстравалі [illegible] фашызму і сказалі праўду пра з[illegible] польскага працоўнага народу ў СССР.

Рэзалюцыя па дакладу т. Чэрвонка

Па дакладу тав. Чэрвонка прынята наступная рэзалюцыя:

«Заслухаўшы справаздачу аб дзейнасьці ўсебеларускага грамадзкага камітэту па правядзеньні выбараў на варшаўскій зьезд палякаў, якія жывуць па-за межамі Польшчы, Усебеларускі зьезд працоўных палякаў БССР цалкам ухваляе дзейнасьць камітэту, і лічыць яго палітычную лінію зусім правільнай.

Зьезд вітае ініцыятыву польскіх грамадзкіх арганізацый: польскага клюбу, газэты «Орка», польскай сэкцыі БелАППу, якія ўзялі на сябе ініцыятыву стварэньня Менскага грамадзкага камітэту і далі пачатак цэламу грамадзкаму руху польскіх працоўных мас БССР.

Зьезд канстатуе вялікую ініцыятыву і зацікаўленасьць шырокіх польскіх мас рабочых сялян і працоўнай інтэлігэнцыі (233 выбарчых пункты, 8 акруговых канфэрэнцый, з 412 дэлегатамі і дзесяткі тысяч галасаваўшых) у правядзеньні выбараў дэлегатаў на варшаўскі зьезд і зьбіраньня на гэтую мэту грашовых сум (ужо сабрана 8.157 руб.).

Зьезд пастанавіў вылучыць рэвізійную камісію для праверкі фінансавай дзейнасьці грамадзкага камітэту.

Выказваючы камітэту падзяку за яго дзейнасьць, зьезд лічыць неабходным існаваньне ўсебеларускага грамадзкага камітэту да часу звароту дэлегацыі з варшаўскага зьезду ў мэтах арганізацыі інфармацыі аб варшаўскім зьезьдзе.

Зьезд лічыць ліквідаванымі ўсе акруговыя грамадзкія камітэты і прапануе ўсе дакументы перадаць усебеларускаму грамадзкаму камітэту.

„Не патрэбны нам апякуны-пілсудчыкі“

(Мазыр)

З вялікаю зацікаўленасьцю і дзелавою актыўнасьцю праходзіць акруговая канфэрэнцыя рабочых і сялян-палякаў Мазырскае акругі. Па дакладу аб дасягненьнях ў сацыялістычным будаўніцтве і ўдзеле польскага насельніцтва выступіў рад дэлегатаў, якія з усёй шчырасьцю расказвалі аб сваіх дасягненьнях, параўноўваючы іх з дарэвалюцыйным часам.

— Я прашу перадаць усім рабочым і сялянам, што знаходзяцца ў Польшчы, —кажа дэлегат, селянін з в. Грушаўка, Нараўлянскага раёну — чаго мы тут дасягнулі пры савецкай уладзе. У нашай вёсцы пабудавалі новую школу, нашы дзеці навучаюцца на сваёй роднай мове, мы арганізавалі машыннае таварыства і жывем так, як ніколі нікому з нас і ня думалася.

Другі дэлегат расказаў, як у часы польскай акупацыі ў іх вёску прыехаў польскі конны атрад супакоіць сялян-палякаў, якія спрачаліся з панамі за зямлю. Перш-наперш яны ўзяліся за кароў, гусей, сьвіней... Пачаўся плач... Пайшлі прасіць пана паручніка забараніць салдатам рабаваць.

— Пся крэў!..—адказаў паручнік і пачаў нас лупцаваць.

— Ад гэтых «апякуноў» мы адмаўляемся. **Наша бацькаўшчына тут, у Савецкім Саюзе** — заяўлялі дэлегаты.

Усеукраінскі зьезд працоўных палякаў

КІЕЎ, 1. 2-га ліпеня адкрываецца ўсеукраінскі зьезд працоўных палякаў пры ўдзеле 150 дэлегатаў з рашаючым і 50 з дарадчым голасам. Да зьезду прыстасована выстаўка дасягненьняў польскага працоўнага насельніцтва ў СССР. На зьезд прыехаў стары польскі рэвалюцыянэр тав. **Вартвінскі,** які пражывае зараз у польскім Мархлеўскім раёне на Валыні.

Віцебская дэлегацыя

АНТЫСАВЕЦКАЯ ІНТРЫГА Ў ПАРЫЖЫ

За сьпіною канфэрэнцыі экспэртаў буржуазная Нямеччына прадавала свой удзел у антысавецкім блёку

БЭРЛІН, 30. «Бэрг Вэркіпэ Цайтунг», а таксама іншых правінцыяльных [illegible] кіркіку надрукован адзін і той самы артыкул Карла Вітыга пад загалоўкам—«Хто быў пасярэднікам у Парыжы?» Зьмест досыць вялікага артыкулу Вітыга скрозь і ўсюды пацьвярджае заявы камдэпутата Штэкэра ў рэйхстагу адносна ўдзелу былога міністра замежных спраў фон-Кюльмана, генэрала фон-Ліпэ і Арнольда Рэхбэрга ў ролі пасярэднікаў паміж нямецкім урадам і францускім міністэрствам замежных спраў. Вітыг падкрэсьлівае, што перагаворы вяліся, як па пытаньні аб павялічэньні кантынгэнту нямецкае армії (аб падваеньні яе), так і па пытаньні аб звароце Нямеччыне яе калёній, а таксама аб нямецка-францускім ваенным саюзе, накіраваным супроць СССР.

Далей, у артыкуле зазначаецца, што фон-Кюльман спачатку зьвярнуўся з гэтымі прапановамі да ангельскага ўраду і спэцыяльна езьдзіў з гэтага поваду ў Лёндан, але тагочасны міністар замежных спраў Чэмбэрлен накіраваў яго да ангельскага пасла ў Парыжы Тэрэля. Той паглядзеў на прапановы Кюльмана недаверліва, патрабаваў іх у пісьмовым выглядзе і пратэлеграфаваў іх у Лёндан. У выніку—прадстаўленьне ангельскага пасла ў Бэрліне нямецкаму міністэрству замежных спраў і нават асабістая заява аб прапановах Кюльмана, зробленая ангельскім міністрам замежных спраў Штрэзэману. Штрэзэман адмовіўся прыняць паведамленьне свайго брытанскага калегі на тэй падставе, што яго належыць адрасаваць туды, адкуль выходзіла прапанова, самжа ён гэтай справай зусім ня цікавіцца.

Справа Дабраджэану зноў будзе перагледжана

ВЕНА, 1. Як паведамляюць з Бухарэсту, румынскі рэвалюцыянэр Дабраджэану ў выніку 10-дзённае галадоўкі дабіўся таго, што яго справа будзе зноў перагледжана; апрача таго, судовая ўлада разгледзіць пытаньне аб прыстасаваньні да яго амністыі.

Адстаўка эстонскага ўраду

РЭВЭЛЬ, 2. Орган «Ваба Маа» паведамляе, што ўрад Рэя (с.-д.) яшчэ ў суботу 29-га чэрвеня парашыў падаць у адстаўку. Урадавы крызіс выклікан трудавікамі, прадстаўнікі якіх ва ўрадзе разышліся з большасьцю па пытаньні аб назначэньні новых дырэктароў вямельнага банку і заявілі аб сваім выхадзе з ураду.

Попацкая дэлегацыя

У Заходняй Беларусі

Арганізавана т-ва дапамогі галадаючаму насельніцтву

ВІЛЬНЯ, 29. У Варшаве залажылася Таварыства пад такою назваю. Членамі-закладчыкамі зьяўляюцца дэпутаты Беларускага сялянска-рабочага клюбу. Статут т-ва быў пададзены на рэгістрацыю у міністэрства ўнутраных спраў і паскольскі ад гэтага тэрміну прайшло больш 2-х месяцаў—лічыцца зарэгістраваным. Т-ва ставіць сваёю мэтаю ня толькі дапамогу галадуючым, але таксама збор і апрацоўку статыстычных матар'ялаў для выяўленьня прычын і абхвату неўраджаю.

На арганізацыйным сходзе закладчыкаў Таварыства выбраны прэзыдыум галоўнага камітэту ў такім складзе: старшыня—дэп. Ф. Валынец, намесьнік старшыні—дэп. П. Крынчык, сэкратар —дэп. Я. Гаўрылік, скарбнік—Я. Грэцкі. У Вільні адчынена аддзяленьне галоўнага камітэту.

На 15 чэрвеня Таварыства налічвала 113 членаў у 10 аддзяленьнях, з якіх у Баранавіцкім павеце—3, у Вялейскім 3, у Беластоцкім—2, у Браслаўскім—1, у Навагрудзкім—1.

КАНФІСКАЦЫЯ «ПРАЛОМУ»

ВІЛЬНЯ, 29. У Гарадні 19-га чэрвеня выйшла беларуская аднадзёўка «Пралом», якая была адразу канфіскавана без абвяшчэньня прычын. У аднаднёўцы былі зьмешчаны артыкулы і заметкі: «Зьезд Т-ва беларускае школы адбыўся», «Першы май 1929 г. на Заходняй Беларусі», «Прычыны голаду», «Рэзалюцыі, прынятыя на агульным сходзе Т-ва беларускае школы 19-20 мая г. г.», «Падзеі на Лукішках» і «Аб беларускім прытулку ў Горадні».

(«Сьвет»).

Фын Юй-сян і Ен Сі-шан выяжджаюць за граніцу

ПЭЙПІН, 1. У інтэрв'ю з прадстаўнікамі друку Ен Сі-шан (які прыехаў у Пэйпін на 3 дні для перагавораў з Чан Кай-шы) заявіў, што ён пакідае свой пост і разам з Фынь Юй-сянам выяжджае ў Японію, дзе будзе ён пэўны час, а ўвосень ён і Фынь Юй-сян мяркуюць паехаць у Амэрыку і Эўропу. Агэнцтва Го'Вэнь паведамляе, што Ен Сі-шан абяцаў Чан Кай-шы праз год вярнуцца ў Кітай.

Амэрыканскія трактары для СССР

МАСКВА, 2. З поваду заключанага Амгандлем дагавору з амэрыканскімі фірмамі на дастаўку для СССР трактараў, супрацоўніку ТАСС паведамілі ў Маскоўскім прадстаўніцтве Амгандлю па ступнае:

Дагавор заключаны з дзьвюма буйнейшымі амэрыканскімі фірмамі сельскагаспадарчага машынабудаўніцтва: «Інтэрнацыонэл Хорвэстэр Кампані» і «Бір і Кампані» на дастаўку 6.750 трактараў. З іх 1.750 трактараў СССР атрымае ў канцы ліпеня, якія пачнуць эксплёатавацца ў час васеньняй пасеўнай кампаніі, а рэшта—у лістападзе-сьнежні. Дагавор зроблен на ўмовах растэрмінаваньня плацяжоў да 3-х год. На прадпрыемствы «Інтэрнацыонэл Хорвэстэр Кампані» будуць пасланы савецкія тэхнікі для навучаньня і практыкі. Апрача таго, фірма павінна прысласць сваіх інжынэраў у СССР для кансультацыі па наладжаньні трактарных рамонтных майстэрань.

Сутычкі паміж бастуючымі рабочымі і [illegible] брэхэрамі ў Бамбэі

ЛЁНДАН, 2. Як паведамляюць з Бамбэю, там здарыліся сутычкі паміж пікетамі рэвалюцыйнага прафсаюзу тэкстыльшчыкаў Гірні Камгар (чырвоны [illegible] сьцяг) і штрэйкбрэхерамі. [illegible] пастаўлена [illegible] сутычцы [illegible] дзацей.

Гірні Камгар [illegible] працаваць [illegible] на роднай мове, [illegible] рмальна.

Заканчэньне аб'яднаньня Кітая—пустыя словы

Паведамленьні, прысьвечаны канфлікту паміж Фынь-Юй-сянам і Нанкінным складаюць зараз ледзь не 9/10 усяе інфармацыі аб Кітаі. Амаль тое-ж самае наглядалася і ў разгар нанкін-гуансійскай вайны, цяпер ужо амаль ліквідаванай. Зразумела, некаторыя посьпехі Нанкіна ў барацьбе з варожымі яму згрупамі наўрад ці хто стане адмаўляць. Але што-ж выходзіць? Гаунсійская зграя разьбіта. Лі Цзунь-вень і Бай Цзун-чы скарочаны, але на месцы Бай Цзун-чы зьяўляюцца на сцэну Тан Шэн-чы, а ў страчаным Лі Цзун-вэне дагэтуль узмацняецца Хо-Цзян. Нанкін аказваецца прымушаным узмацніць Ен Сі-шана і ісьці на далейшыя ўступкі Тан Шэн-чы, ня кажучы ўжо аб уступках, якія робіць мукдэнскай зграі.

Такім чынам, і ў галіне «унутраное дыплёматы» адзін кампраміс ідзе за другім. Злучнасьць усіх гэтых кампрамісаў у значнай меры зводзіць да нуля аб'яднальнае значэньне войн Нанкіна, робіць посьпехі яго большай часткаю чыста знадворнымі. Арміі пераможаных супраціўнікаў, як правіла, не распускаецца, а толькі «рэарганізуецца», а гэта рэарганізацыя складаецца галоўным чынам з нязначных зьмен вышэйшага каманднага складу. **Пры такім становішчы гаварыць аб «хуткім заканчэньні аб'яднаньня Кітаю» наўрад ці прыходзіцца.** У галіне палітычнага і сацыяльнага рэфарматарства справа стаіць яшчэ горш. Дыплёматычныя выступленьні Нанкіна, яго барацьба з гуансійцамі і Фынам як і яго «рэфарматарская дзейнасьць»,—усё гэта як бы зьява на паверхні палітычнага жыцьця Кітаю.

А зваду гэтай напоўблазанскай інсцэніроўкі трывожна буркоча ўсхваляваны народны акіян. Сярэд шырокіх мас адбываюцца глыбокія рэвалюцыйныя працэсы, ідзе, то глуха заміраючы, то зноў яскрава выбухаючы, упартая рэвалюцыйная барацьба. «Ілюзорнасьць уздыму ў дзьвярах Цзянсу... Але зваду вялізныя абшары галоднага Кітаю, дзе патрабаваньні зьберчыкаў падаткаў узрастаюць нясупынна. Публікаваць маніфэсты з заклікам згуртавацца вакол ураду, супроць камунізму,—ці-ж гэта не ідыётызм, калі ўсё, што ні робіць гэты ўрад, зьяўляецца ўдзячным матар'ялам для камуністычнае прапаганды». Так скардзіцца і епчыць брытанская «Норд Чайна Дейлі Ньюс», якая бачыць у прыватнасьці ў Паўночным Кітаі «усе даныя, якія могуць выклікаць новае Тайпінскае паўстаньне».

Што сказаць тады аб Поўдні, дзе сапраўды «мільёны насельніцтва набылі вялікую практыку самых рознастайных фэрм масавай і непасрэднай рэвалюцыйнай барацьбы аж да «ўсеагульнай забастоўкі», вытканьня памеж чыкаў, зьнішчэньня іх маёнткаў, адкрытага ўзброенага паўстаньня». Пра гэта тэлеграфныя агэнцтвы, заняты склокай у буржуазным лягеры, зараз амаль нічога не паведамляюць. А між тым, ужо адна гэраічная эпапея партызанскага руху чырвоных атрадаў Пэн Тэ-хуая, Фан Чжы-міна, Ван-Цзо, Юан Вень-тая, а асабліва Чу-тэ і Мао Цзы-туна, які ўжо на працягу двух год пераходзяць з аднаго раёну ў другі, з аднэй правінцыі ў другую, займаюць гарады і паветы і ўсюды робяць рэвалюцыйную справу,—адна гэта эпапея кітайскага паўстанчага руху прадстаўляе вялікую зацікаўленасьць і значнасьць, асабліва на агульным грозным фоне Кітаю, калі страшная рука голаду, што гуляе на неўраджайных правінцыях, вярбуе новыя мільёны ў вялікую армію надыходзячага паўстаньня. («Правда).

АЖЫЎЛЕНЬНЕ СЯЛЯНСКАГА РУХУ Ў ІНДЫІ

Індыйскі друк за сакавік і красавік сьведчыць аб значным ажыўленьні сялянскага руху. Цяжка судзіць аб кіраўніцтве рухам; паведамленьні друку не даюць магчымасьці больш падрабязна характарызаваць нанава ўзьнікаючыя арганізацыі; патрабаваньні, што імі выстаўляюцца, таксама асьвятляюцца далёка ня поўна.

У адзнаку ад пэрыяду параўнальнага зацішша, пасьля паражэньня рэвалюцыі 1919-22 году, сялянства зараз зноў выстаўляе патрабаваньні ліквідацыі памешчыцкай уласнасьці, у той час, як у пэрыяд 1922-1928 г барацьба вялася галоўным чынам, за зьнижэньне пазямельнага падатку.

Газэта «Бамбэй Кронікль» ад 22 красавіка паведамляе аб сялянскай канфэрэнцыі ў галіне Ратнагайры, якая адбывалася 14 красавіка. Выступаўшыя тубыльныя інтэлігенты заяўлялі, што становішча сялян нагадвае становішча францускага сялянства напярэдадні Вялікай рэвалюцыі. Газэта падае ўхвалены рэзалюцыю, у якой гаворыцца: «Сыстэма зямляўладаньня кхотаў (памешчыкаў) ня можа быць зьменена, яна павінна быць зьнішчана з коранем. Гэта сыстэма, пры якой з сялянствам абыходзяцца горш, чым з рабамі». Па дамаганьні д-ра Амбэдкара, адваката, абранага прадстаўніком канфэрэнцыі, у якасьці сродкаў барацьбы намечаны толькі «захват усіх месц у заканадаўчым сходзе і правядзеньне законаў, якія паляпшаюць становішча сялянства».

Ня менш цікавае паведамленьне газэты «Нацыянальны Гэрольд» аб сялянскай канфэрэнцыі Пэнджаба, якая адбылася 9-га сакавіка ў горадзе Ратаку пад старшынствам Арджуняляль Сэт. Канфэрэнцыя ўхваліла рэзалюцыю аб зьнішчэньне ўласнасьці буйных памешчыкаў заміндараў, аб тым, што сяляне не павінны прымаць удзел у імпэрыялістычных войнах Англіі і, нарэшце, аб тым, што пазямельны падатак павінен трацінца не на вайсковы бюджэт або пабудаваньне новай сталіцы Дэлі, а на ўзьняцьце сялянскае гаспадаркі. У якасьці сродку барацьбы намечана адмаўленьне ад плацяжу падатку.

У абласной палітычнай канфэрэнцыі ў Руканцуры (Злучаныя правінцыі) прысутнічала 500 сялян з вакольных вёсак, якія выказалі энэргічны пратэст супроць «арышту 31-га правадыра рабочых і сялян, пасаджаных у турму ў Міруце».

Палітычная канфэрэнцыя Злучаных правінцый таксама зьвярнула ўвагу на сялянскі рух і, у прыватнасьці, на ўрадовыя рэпрэсыі супроць сялянскіх саюзаў. «Тыя, што працуюць з сялянскімі арганізацыямі (кісан-сабхас)—заявіў у сваёй прамове Мулчанд Дубэ—ведаюць, што ўрад прыкладае ўсе намаганьні, каб прыдушыць сялянскія саюзы. Паўапранутыя і паўгалодныя сяляне праходзяць часамі па дзясятку міль, каб спаткацца ў вызначаным месцы, каб расказаць адзін аднаму аб сваіх патрэбах і труднасьцях. Сялян прыдушаюць, а іх правадыроў садзяць у турму па 107 арт. індыйскага крымінальнага кодэксу»

З г. Патны газэта «Нацыянальны Гэрольд» ад 23-га сакавіка паведамляе аб сутычцы паміж арэндатарамі і памешчыкамі ў буйным маёнтку Думрао. Ангелец-кіраўнік быў забіты, некалькі арандатараў паранены, двое забіта. Падрабязнасьцяй у друку няма.

«Бамбэй Кронікль»—гэты вельмі добра паінфармаваны орган індыйскай тэкстыльнай прамысловасьці — піша: «Аграрное нездаваленьне, што расьце ва ўсёй краіне, мае значна больш шырокі і сур'ёзны характар, чым многія думаюць. Наколькі нам вядома, акрамя Ратнагайры, сялянскія саюзы хутка растуць і ў іншых мясцох».

Адначасова працягваецца рух, накіраваны супроць падаткоўай эксплёатацыі сялянства, галоўным чынам, у Бамбэйскім прэзыдэнцтве, дзе адбываўся таксама рух 1928 г. Так, у краіне Пальга пад старшынствам Б. Н. Шаха створана сялянская арганізацыя ў мэтах барацьбы супроць 33 процантнага павышэньня пазямельнага падатку. З Малегаона газэта «Бамбэй Кронікль» паведамляе, што сяляне 25-ці кругавых вёсак сабраліся ў ліку 3.000 чалавек 1-га красавіка на мітынг пратэсту супроць павышэньня пазямельнага падатку. З краіны Даскрой (паблізу Ахмэдмбада) тая-ж газэта паведамляе аб пачатку кампаніі пасыўнага супраціўленьня на ўзоры кампаніі ў Бардолі. Аднак, гэта кампанія, што пачалася была 18-га красавіка, ужо 19-га была скасавана па атрыманьні інструкцыі ад цэнтральнага камітэту нацыянальнага кангрэсу. Было абвешчана, што кампанія ўсё-ж будзе праводзіцца, «калі ўрад застанецца глухім да нашых патрабаваньняў».

М.

Падрыхтоўка да міжнароднага чырвонага дня

Падрыхтоўчая кампанія бэльгійскае кампартыі

БРУСЭЛЬ, 27. Орган бэльгійскае кампартыі «Драпо Руж» вядзе кампанію па падрыхтоўцы міжнароднага чырвонага дня 1-га жніўня. Орган лібэральнае партыі, паведамляючы пра кампанію «Драпо Руж», абяцаў даць рад выкрыцьцяў аб «бальшавіцкай змове супроць Бэльгіі». Буржуазная газэта сьпіць «нелегальныя бальшавіцкія арганізацыі, які нібы тоняцца пад формаю розных легальных арганізацый і скарыстоўваюць для сваіх мэт нават аргыцтых і лева-буржуазных і сацыялістычных палітыкаў. Газэта абяцае выкрыць усіх гэтых вольных і нявольных дапаможнікаў бальшавізму і скардзіцца на нявыстарчальнасьць законных і матар'яльных сродкаў, якія яна мае для гэтае мэты».

Адозва францускага камсамолу

ПАРЫЖ, 28. «Авангард», орган францускага камсамолу заклікае ўсіх маладых рабочых кінуць 1-га жніўня работу і прыняць удзел у вулічных дэманстрацыях. Адозва прапануе ўсім маладым рабочым, салдатам і маракам аб'яднацца ў барацьбе за іх штодзённыя патрабаваньні і супроць імпэрыялістычнае вайны. Рабочая моладзь павінна стварацъ камітэты па правядзеньні 1-га жніўня і згуртоўваць свае кадры вакол гэтых камітэтаў, стварыць групы самаабароны і ўзмацняць рады маладой гвардыі.

ПАРТЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА

Генэральная праверка і чыстка партыйных радоў

яшчэ больш узмоцніць сувязь партарганізацый з рабочымі і бядняцка-сялянскімі масамі

Праверыўшы клясава-палітычную стойкасьць кожнага камуністага, партыя яшчэ шпарчэй пойдзе ўперад да новых перамог на фронце сацыялістычнага будаўніцтва

Пазбавіць партыю ад чужакоў

Чыстка партыі зьвязана з вялікімі труднасьцямі і можа быць пасьпяхова праведзена толькі пры дапамозе ўсіх членаў партыі і беспартыйных рабочых і сялянскіх мас. Асабліва дакладна трэба праверыць савецкія ячэйкі, бо іменна ў гэтых ячэйках магчыма найбольш шырокае скарыстаньне партыйнага становішча ў карыслівых мэтах.

Да ўсеКП(б), як да ўрадовай партыі, імкнуцца прымазацца чужыя элементы, кар'ерыстыя, таму засьмечанасьць савецкіх ячэек няўхільна. Часамі праз савецкія ячэйкі пралазяць у партыю пават актыўныя белагвардзейцы, каб унікнуць пакараньня і зноў змагацца супроць нас шляхам разлажэньня дзяржапарату. Ленін ня раз наказваў, што «да нас прысмакталіся сям-там кар'ерыстыя, якія пазваліся камуністамі і ашукваюць нас, якія палезьлі да нас таму, што камуністыя цяпер маюць уладу».

За апошнія гады сацыяльны склад савецкіх ячэек значна палепшыўся і яны пастаянна паладняюцца новымі пластамі, што вылучаюцца з рабочага асяродзьдзя. Але ў некаторых мясцох былыя людзі—дваране, купцы, старыя чыноўнікі складаюць значную праслойку ў нашым апараце. У рэзалюцыі лістападаўскага пленуму ЦК УсеКП(б) 1928 г. гаворыцца: «цяперашні савецкі апарат яшчэ моцна прасякнуты элементамі старога чыноўніцтва і рэшткамі раней пануючых кляс, у якіх яшчэ жывае нянавісьць да савецкага ладу. Бюракратычныя скажэньні, няўважлівыя адносіны да патраб працоўных, абураючая інэртнасьць і злачынная цяганіна нярэдка падрываюць работу дзяржорганаў».

Такое акружэньне ў поўнай меры мае ўплыў на менш устойлівых камуністых, тым больш, што савецкія ячэйкі ў большасьці зусім адарваны ад рабочых мас. Засьмечанасьць савецкага апарату і адрыў яго ад шырокіх мас працоўных зьяўляецца аспоўнай прычынай праяўленьня ў савецкіх ячэйках такіх нездаровых зьявішч, як кумаўства, разлажэньне, сувязь з чужымі элемэнтамі, скажэньне клясавай лініі і інш. Між тым, ад складу савецкіх ячэек і якасьці іх работы залежыць давер'е шырокіх раобчых і сялянскіх мас да савецкага апарату. Савецкія ячэйкі павінны зьяўляецца перадавымі атрадамі партыі па барацьбе з бюракратызмам, цяганінай, кумаўством, растратамі і іншымі хваробамі, якія заражаюць паасобныя ячэйкі нашага дзяржаўнага апарату. Таму пры чыстцы савецкіх ячэек трэба асабліва дакладна правяраць склад гэтых ячэек з тым, каб выгнаць з радоў партыі ўсіх тых, хто абюракраціўся, разлажыўся і зьяўляецца клясава чужым. Гэтыя элементы наносяць вялікую шкоду партыі.

Але акрамя выгнаньня з савецкіх ячэек некамуністычных элемэнтаў у задачы чысткі ўваходзіць яшчэ праверка работы кожнай ячэйкі. Трэба выкрыць і зьнішчыць недахваты ў яе рабоце і навучыць савецкую ячэйку сапраўды змагацца з усімі скажэньнямі нашага дзяржаўнага апарату. Кожны камуністы павінен памятаць, што ён нясе адказнасьць за работу сваёй установы і што член партыі павінен прымаць актыўны ўдзел у паляпшэньні апарату тэй установы, дзе ён працуе.

Падыходзячы пры чыстцы і праверцы савецкіх ячэек са строгімі патрабаваньнямі ў адносінах да членаў партыі, трэба ў той-жа час асьцярожна падыходзіць да вылучэнцаў з рабочых і работніц, якія ў першы час у нярэгулярных умовах работы дапускаюць тыя або іншыя памылкі.

Чыстка і праверка савецкіх ячэек павінна наблізіць савецкія ўстановы да рабочых мас і спрыяць найбольшаму вылучэньню рабочых у дзяржаўны апарат. Толькі цесная сувязь камуністых савецкіх устаноў з фабрычна-заводзкім пралетарыятам дапаможа пасьпяхова змагацца і зьнішчыць бюракратызм, цяганіну і іншыя скажэньні, якія дасталіся нам у спадчыну ад старога чыноўніцкага апарату.

К. М.

Адчуваецца слабасьць падрыхтоўкі

(Лагойская райпартарганізацыя)

Камісія прыступіла да праверкі і чысткі Лагойскай партарганізацыі. Ня мала часу прышлося аддаць камісіі на праверку падрыхтоўкі да чысткі. Пытаньне аб чыстцы абмяркоўвалася на спэцыяльна скліканым пленуме райкому, на якім падагульвалася падрыхтоўчая работа ў ячэйках. Пленум абмеркаваў пытаньне аб задачах чысткі і заслухаў інфармацыі сакратароў ячэек аб тым, што канкрэтна правяла кожная з ячэек да чысткі. Камісія на праверцы і пленум райкому адзначылі, што падрыхтоўка на мясцох праведзена невыстарчальна і таму вырашана паслаць 6 таварышоў з раённага актыву ў вясковыя ячэйкі для ўзмацненьня падрыхтоўкі. Вырашана таксама ў бліжэйшы час склікаць раённую нараду рабселькораў і абмеркаваць на ёй пытаньні чысткі і задачы асьвятленьня яе ў насьцэнгазэтах і друку.

Камісія супольна з пленумам райкому распрацавала каляндарны плян работы па чыстцы і адразу раздала кожнаму сакратару ячэйкі.

Адбыўся першы праверачны сход Лагойскай ячэйкі, на якім старшыня камісіі зрабіў даклад аб задачах чысткі, а сакратар ячэйкі—аб стане і рабоце ячэйкі. На гэтым сходзе прысутнічала 48 партыйцаў і камсамольцаў і больш 100 чалавек беспартыйных сялян і членаў прафсаюзу.

Па дакладу сакратара выказалася толькі 13 чалавек, беспартыйных сярод іх—толькі адзін. Нельга сказаць, што на сходзе была належная актыўнасьць. Гэта сьведчыць аб тым, што падрыхтоўка ў ячэйцы праходзіла слаба. Сярод батрацтва і беднаты ня была праведзена растлумачальная работа.

З 27-га чэрвеня камісія прыступіла да праверкі складу ячэйкі.

Д. П.

Нарада загадчыкаў аддзелаў АК КП(б)Б па рабоце ў вёсцы

Скончылася нарада загадчыкаў аддзелаў АК па рабоце ў вёсцы

Нарада абмеркавала рад важнейшых пытаньняў па далейшай рабоце аддзелаў, рабоце сярод беднаты і г. д.

***

Даклад тав. **Міцькова** аб рабоце і далейшых задачах аддзелаў АК па рабоце ў вёсцы выклікаў ажыўленыя спрэчкі. Удзельнікі нарады спыняліся па ўсіх пытаньнях работы аддзелаў. Нарада адзначыла, што галоўным недахонам у рабоце аддзелаў зьяўляецца:

«Недастатковая сувязь з месцамі, недастатковая дапамога вясковым партыйным арганізацыям у іх рабоце па выкананьні задач партыі ў вёсцы.

Ва ўхваленай рэзалюцыі прыняты рад канкрэтных мерапрыемстваў па ўзмацненьні і паляпшэньні работы аддзелаў. Выразнае правядзеньне клясавай лініі і шпаркае разьвіцьцё калектывізацыі зьяўляюцца асноўнымі задачамі ў рабоце аддзелаў. Нарада падкрэсьліла, што аддзелы па рабоце ў вёсцы павінны ўзмацніць сталае палітычнае кіраўніцтва і практычную дапамогу нізавым партарганізацыям у ажыцьцяўленьні генэральнай лініі партыі па вёсцы.

Быць на чале клясавай барацьбы ў вёсцы, узмацняць тэмп калгаснага будаўніцтва, рашуча змагацца з скажэньнямі клясавай лініі, з канкрэтнымі правамі правага ўхілу і прымірэнцтва ў практычнай рабоце—такія баявыя задачы высунула нарада перад вясковымі аддзеламі.

***

Па дакладу тав. **Манжэлея** аб выніках гаспадарчай і палітычнай работы сярод беднаты нарада адзначыла:

Узмацненьне бядняцка-сераднякцкага блёку і рост палітычнай сьвядомасьці і актыўнасьці бядняцка-батрацкіх мас вёскі.

Рост гаспадарчай дапамогі беднаце па лініі калектывізацыі і вытворчага каапэраваньня, крэдытаваньня і г .д. Фонд крэдытаваньня беднаты павялічыўся да 1½ мільёны рублёў. За апошні год беднаце прадстаўлена розных ільгот на суму каля 3 мільён. руб.

Усё-ж работа па гаспадарча-палітычнай арганізацыі беднаты зьяўляецца слабым вучасткам ва ўсёй рабоце на вёсцы.

Ва ўхваленай рэзалюцыі адзначана, што работа груп беднаты знаходзіцца яшчэ не на належнай вышыні. У радзе акруг былі факты, калі на сходы груп беднаты не дапушчалася серадняцтва.

Нарада прыняла практычныя пастановы па ўзмацненьні работы груп беднаты, бядняцка-сераднякцкага блёку і г. д.

Нарада заслухала і абмеркавала даклад аб становішчы і рабоце камітэтаў сялянскае ўзаемадапамогі

Сустрэнем чыстку падрыхтаванымі

(Бягомельскі р., Менскай акр.)

Толькі прыбыла камісія па чыстцы нашай партарганізацыі, зараз-жа быў скліканы сход партактыву, на якім падрабязна растлумачана аб чыстцы партыі і аб удзеле ў ёй усіх працоўных раёнаў. Потым, 24 чэрвеня быў скліканы пашыраны пленум РК КП(б)Б разам з сакратарамі ячэек, на якім заслухана справаздача бюро РК КП(б)Б. Па дакладу бюро райкому ў спрэчках выступілі амаль усе прысутныя. Пленум прызнаў, што палітычная лінія райкому была правільнай, адначасова адзначыў рад недахопаў у практычнай рабоце. Падкрэсьлена, што выхаваўчая работа партарганізацыі пастаўлена слаба, зімовая і летняя партвучоба амаль што зусім правалена, праца сярод жанчын пастаўлена дрэнна.

Падрыхтоўчая работа да чысткі пад непасрэдным кіраўніцтвам праверачнай камісіі прароблена ў арганізацыі вялікая: у кожнай буйной вёсцы праведзены сходы батрацтва і беднаты, наладжана дзяжурства для прыёму заяў і г. д.

Складзена спэцыяльная рэдкалегія з 5 асоб, якая будзе выпускаць у часе чысткі насьцэнгазэту два разы ў тыдзень.

Наогул падрыхтоўчая работа праведзена вялікая і яна дасьць свае станоўчыя вынікі пры чыстцы.

П. ПРУЧКОЎСКІ.

Пачатак праверкі ў Заслаўі

(МЕНСКАЯ АКР.)

У Заслаўскай райпартарганізацыі пачалася чыстка. Першай правяраецца Заслаўская ячэйка.

Да першага дня чысткі ячэйка выпусьціла насьценную газэту, прысьвечаную пытаньням чысткі. Як недахоп, трэба адзначыць, што акрамя членаў ячэйкі, беспартыйныя актывістыя ў выпуску гэтай газэты ня ўдзельнічалі. Гэта тлумачыцца тым, што падрыхтоўка газэты пачалася толькі з прыездам праверачнай камісіі. Трэба паставіць справу так, каб такія газэты былі выпушчаны перад чысткай ва ўсіх ячэйках з цягненьнем беспартыйных вясковых актывістых і батрацтва.

Першы дзень чысткі, 28 чэрвеня пры ўдзеле 300 чалавек членаў саюзу батрацтва, чыгуначнікаў сялян мястэчка і вакольных вёсак гаворыць за тое што ячэйка і райком здавальняюча правялі работу сярод працоўнага насельніцтва раёну ў значэньні чысткі партыі Гэту работу праверачная камісія за кароткі час значна паглыбіла.

Першым праходзіць праверку т. Лавец (партстаж з 1919 г.), селянін з вёскі Навашына. Ён расказвае, што гаспадарка яго бядняцкая, увесь час вызваляецца ад падатку. Ён зараз член райкому КП(б)Б і старшыня мэліярацыйнага таварыства. Адзін сын яго член КП(б)Б, другі камсамолец, трэці піянэр Тав. Лаўца ўсе камуністыя і беспартыйныя добра ведаюць, таму і не задаваліся яму пытаньні. Ён праходзіць праверку пад гучныя воплескі шматлюднай аўдыторыі.

Пры праверцы сакратара ячэйкі тав Баўфалава (партстаж з 1919 г), сакратара райкому тав. Гутмана (партстаж з 1920 г.) і старшыні РВК тав. Шэлега (партстаж з 1917 г.) як камуністыя, так і беспартыйныя зазначалі, што гэтыя таварышы ўстойлівыя і правільна праводзяць клясавую лінію ў практычнай рабоце, цесную сувязь маюць з масамі.

Усім таварышом, якія праходзілі праверку (іх 10 чалавек), прысутныя ў сваіх выступленьнях давалі характарыстыкі. Пры праверцы некаторых таварышоў выступала на некалькі чалавек з характарыстыкамі. З выступленьняў можна было заўважыць, што беспартыйны батрацка-бядняцкі і серадняцкі актыў у асноўным разумее задачы чысткі.

Як члены ячэйкі, так і беспартыйныя ўсебакова высьветлілі станоўчыя і адмоўныя бакі ў рабоце правераных.

П.

****

ЧЫСТКА РАДОЎ ПАРТЫІ на Урале

СЬВЯРДЛОЎСК, 2. Пры чыстцы радоў партыі на Урале наглядаецца шмат эпізодаў, якія характарызуюць адносіны безпартыйных да гэтай важнай работы. У Іншые чыгуначнае дэпо было перапоўнена да адказу; прысутнічала шмат безпартыйных. Адбылася праверка члена АКК Гуменнікава. Яго характарыстыка беззаганна. Яго выступленьне з жыцьцёпісам прарываецца нечакана запытаньнем безпартыйнага рабочага: «ці ня ты пры Калчаку рабіў вобыскі рабочых кватэр, ці ты ня шпіёніў сярод палонных чырвонаармейцаў».

Другі рабочы даў запытаньне: «Чаму разьбіраў нашу дарогу, калі мы адступалі. Гуменьнікаву ня было чым апраўдацца. Камісія ўсе заявы рабочых праверыла і ўсё пацьвердзілася. Гуменнікаў быў выключаны з радоў партыі. Тут жа ячэйка дэпо прыняла ў партыю Шэнгірава, які заявіў:

«Бачу, што партыя моцная, праверае свае рады і чысьціць усё нягоднае, таму прашу прыняць мяне ў партыю. Лічу, што ніводзін рабочы і селянін не павінен стаяць у баку ад партыі».

***

АРЦЁМАЎСК, 2. Да гэтага часу праверана адна вайсковая, з савецкіх і 23 сельскіх ячэйкі з агульным лікам 936 партыйцаў. За адрыў ад партыі, сувязь з чужым элемэнтам і іншыя анты-камуністычныя ўчынкі выключаны 103 чалавекі. Прыкладна, на 15 проц. усіх праверанных ускладзены розныя спагнаньні. Беспартыйная маса з неаслабнаю зацікаўленасьцю сачыць за ходам чысткі, усямерна дапамагаючы работам праверачных камісій. На сходах сельскіх парт'ячэек прысутнічала 4.500 сялян.

***

МІКАЛАЕЎ, 2. У раёнах акругі заканчваецца чыстка партарганізацыі. Процант выключаных хістаўся ад 5 да 17. У Карла Лібкнэхтаўскім раёне, дзе зімою было выяўлена рэзкае выкрыўленьне клясавае лініі, гэты процант дайшоў да 31.

Аб падрыхтоўцы да чысткі партыі і росьце Чэрыкаўскай арганізацыі

(МАГІЛЕЎСКАЯ АКР.)

Пытаньні генэральнай чысткі партыі зараз займаюць і павінны займаць асноўную ўвагу ўсіх партарганізацый. Але ёсьць яшчэ асобныя арганізацыі і ячэйкі, якія яшчэ і да гэтага часу невыстарчальна ўявілі сабе паважнасьць практычнага ажыцьцяўленьня гэтай задачы і слаба праводзяць падрыхтоўчую работу да чысткі.

У Чэрыкаўскай райпартарганізацыі праз дзень пачынаецца чыстка. Праўда да гэтага часу на адкрытых сходах большасьці парт'ячэек абгаворвалася пытаньне чысткі. Але ёсьць у партарганізацыі асобныя партыйцы, якія не разумеюць асноўных задач чысткі партыі. Вось адзін прыклад: член партыі Рынкоўскай ячэйкі тав. Аўсянка разважае аб чыстцы так: «чыстка будзе датычыць толькі тых, хто адтрымлівае вялікую пэнсыю, а нас сялян яна мала датычыць». А падобных разважаньняў сярод некаторых партыйцаў мы можам пачуць больш. Праведзена адпаведная праца райкомам КП(б)Б і ячэйкамі па выкрываньні хваравітых зьявішч у арганізацыі, якія ёсьць за асобнымі партыйцамі. Прапрацоўка інструкцыі ЦКК у асобных ячэйках праходзіла паўрхоўна, у выніку чаго ў Рэчыцкай ячэйцы дрэнна ведаюць, як будзе практычна праводзіцца чыстка партыі.

За апошнія часы наглядаецца некаторы зрух у справе росту партарганізацый. Калі за другое паўгодзьдзе 1928 году ў рады КП(б)Б было прынята 5 таварышоў, з іх 1 рабочы, 1 батрак і 3 сяляне-беднякі, што ўжо з пачатку 29 году, асабліва з часу XII зьезду КП(б)Б, прынята 20 чалавек, з іх 6 рабочых, 1 батрак, 1 калгасьнік і 12 сялян-беднякоў. Але-ж улічваючы, што ў арганізацыі налічваецца 51 проц. (49 чалавек) служачых і 36 сялян (сярод іх вялікая праслойка сераднякоў) і толькі 11 рабочых пры адсутнасьці батракоў, гэты тэмп росту і яго якасьць трэба прызнаць нездавальняючымі, асабліва за лік батрацтва і калгасьнікаў. І гэта не выпадкова таму, што ў самым райкоме няма нават ведаў аб колькасьці ў раёне батракоў і сельгасрабочых. Асобныя ячэйкі, як Губішчынская, Верамеўская, Ветрынская пытаньнямі росту зусім не займаліся і ніякай работы сярод батрацтва не праводзілі.

Самы галоўны недахоп падрыхтоўкі да чысткі партыі ў Чэрыкаўскай арганізацыі—гэта адсутнасьць увязкі падрыхтоўчае работы з задачамі рашучага наляпшэньня ўсяе работы партарганізацыі, уздыму клясавае пільнасьці кожнага камуністага. Той час, які застаўся да чысткі, ячэйкі павінны скарыстаць для ўзмацненьня падрыхтоўкі да чысткі. Трэба кожнай ячэйцы памятаць, што шырокае прыцягненьне рабочых, батрацкіх мас і вясковай беднаты на праверачныя сходы дасьць добрыя вынікі пры правядзеньні чысткі.

А. ДОЎГІ.

Масы разумеюць задачы чысткі

(КОЙДАНАЎСКАЯ РАЙПАРТАРГАНІЗАЦЫЯ, МЕНСКАЙ АКРУГІ)

Праверка партарганізацыі ідзе ўжо некалькі дзён. Партыйныя масы, рабочыя, батрацтва і сяляне-беднякі выяўляюць на праверачных сходах вялікую актыўнасьць. Правяраецца ячэйка КП(б)Б лесазаводу Койданаўскага камбінату. У пардоме, дзе адбываецца праверка, амаль усе рабочыя заводу...

На першым праверачным сходзе заслухоўваўся даклад сакратара аб стане і рабоце ячэйкі лесазаводу. Даклад выявіў, што ячэйка ў параўнаньні з мінулым ва ўсіх адносінах стала працаваць лепш, вырас яе аўтарытэт сярод рабочых.

На сходзе зазначана, што адзін з самых буйных недахватаў ячэйкі гэта тое, што яна амаль зусім за мінулы год не расла. Падкрэсьліваліся і другія недахопы як: усё яшчэ невыстарчальная разгорнутасьць культурна-масавай работы, няўвязка ў рабоце «трыкутніка», хваравітыя зьявішчы сярод асобных партыйцаў. Сярод выступаўшых па дакладу ячэйкі было шмат беспартыйных рабочых. Пасьля абгаварэньня дакладу камісія прыступіла да праверкі асабовага складу ячэйкі. Першым праходзіць праверку тав. Безік, член партыі з 1917 году. Пасьля зачытаньня аб ім кароткіх вестак выступіўшыя таварышы абвінавачваюць яго ў радзе антыпартыйных учынкаў: у сыстэматычным п'янстве і інш. Прысутныя падаюць рад пытаньняў, накіраваных на высьвятленьне яго антыпартыйных учынкаў і таго, як ён праводзіў партыйную работу.

За ім правяраецца тав. Карначоў—член партыі з 1919 г., зараз працуе старшынёю РВК Тав. Карначоў прымаў актыўны ўдзел у барацьбе з бандытызмам, на радзе адказных пасад выявіў сябе, як стойкі і вытрыманы партыец. Прысутныя партыйцы, рабочыя і сяляне характарызуюць яго, як добрага працаўніка і гаспадарніка.. Пад воплескі ўсяе аўдыторыі камісія канчае правяраць т. Карначова.

Тая актыўнасьць, якая выявілася па сходзе, паказвае, што партарганізацыя добра падрыхтавалася да чысткі.

ЦУДЗІН.

Выкрываем і выганяем з партыі падкулачнікаў

(КАПЫЛЬСКАЯ РАЙПАРТАРГАНІЗАЦЫЯ, МЕНСКАЯ АКР.)

Камісія ў складзе т. т. Барушка (старшыня), Якаўлева і Дзежыца прыступіла да праверкі ячэек КП(б)Б Капыльскага раёну. За некалькі дзён да пачатку практычнай работы па праверцы камісія правяла адпаведную падрыхтоўку, шырока папулярызаваўшы задачы чысткі сярод партыйных мас і працоўнага насельніцтва. І гэта дало сабе адчуваць у станоўчым сэнсе, калі пачалася чыстка ячэек: партыйныя масы выяўляюць вялікую актыўнасьць на праверачных сходах, беспартыйныя батракі і сялянская беднота дапамагаюць камісіі ў выяўленьні палітычнага твару кожнага камуністага.

Галоўная ўвага пры праверцы таго ці іншага партыйца накіроўваецца на тое, як ён у практычнай рабоце праводзіў генэральную лінію партыі, наколькі выразна ўстанова якою кіруе партыец, забясьпечвае правядзеньне клясавай лініі.

А выпадкі, калі некаторыя камуністыя не праводзілі яе ў штодзённай рабоце сваіх устаноў былі. Так, пры праверцы тав. Рубіс—члена партыі з 1919 году, які зараз працуе старшынёй с.-г. крэдытнага таварыства, было задана такое пытаньне.

— Які склад працаўнікоў таварыства на сацыяльным становішчы?

Гэта пытаньне пасьлужыла повадам і дало магчымасьць высьветліць, што ў апараце т-ва ўсе галоўныя пасады (па загатоўцы сыру, па закупцы коняй і інш.) займаюць былыя спэкулянты.

Ці можаце вы пры такім складзе апарату праводзіць клясавую лінію?—пытаюцца ў тав. Рубіса.

— Палітыка можа і няправільная, але іншага выхаду няма, патрэбны спэцы, а іх няма,—так літаральна адказаў тав. Рубіс. А на запытаньне, што зроблена для падрыхтоўкі працаўнікоў з асяродзьдзя батракоў, дэмабілізаваных чырвонаармейцаў і беднаты, на гэта пытаньне ў правяраемага няма адказу. Апрача поўнага неразуменьня клясавай палітыкі партыі, апрача таго, што ён сьцьвярджае «няма выхаду», т. Рубіс выкарыстоўваў сваё службовае становішча для розных карысьлівых махінацый (купляў у бацькі хворых кароў для таварыства, утойваў аб'екты ад уліку па с.-г. падатку ў гаспадарцы бацькі).

А вось і другі правяраемы тав. **Янушка**—член партыі з 1926 г., старшыня Мялешынскага сельсавету. Ён, завёўшы сваяцтва, трымае сувязь з папом, сваіх сваякоў вызваляў ад с.-г. падатку, наперакор нашым савецкім законам крэдытаваў лесам і г. д. Нават больш гэтага сельсавет вызваліў ад падатку былога балахоўца Брушкевіча, як бедняка, а ў гэтага «бедняка» сам старшыня сельсавету (правяраемы) купляў сена. Потым пры праверцы гэтага «бедняка» высьвятлілася і знайшлася неабходнасьць, згодна закону, абкласьці падаткам у суме 96 руб.

На выбарах сельсавету была высунута кандыдатура кулака і калі яна абгаворвалася, «партыец» Янушка «выпадкова вышаў у другі пакой». Дзеці кулакоў яго сельсавету вучацца ў сямігодцы, а для бедняцкіх не хапае месц. Першыя сходы, якія ўжо адбыліся, ня выявілі ўсіх тых момантаў скажэньня клясавай лініі, якія былі з боку асобных камуністых.

У вогуле аб першых праверачных сходах трэба сказаць, што, дзякуючы ўважлівому падыходу да кожнага правяраемага з боку камісіі і сходу, выяўляецца рад такіх асоб, якім бязумоўна ня месца ў партыі. Сходы паказалі, што некаторыя партыйцы ў палітычных адносінах вельмі адсталыя. Камуністы-настаўнікі і тыя дрэнна разьбіраюцца ў больш менш складаных палітычных пытаньнях. Гаворачы аб настаўніках-камуністых нельга не паказаць на тое, што райком і ячэйкі ня цікавіліся, як гэтыя таварышы працуюць у школе, як разгортваюць грамадзкую работу ў вёсцы.

Трэба заўважыць, што большасьць выступаўшых на праверачных сходах гавораць «за», што прымушае зрабіць вывад аб тым, што крытыкаваць пасапраўднаму кагосьці пабойваюцца.

На праверачных сходы праб

Увагаліва вывучаць склад працаўнікоў

Добрая падрыхтоўка да чысткі дае добрыя вынікі

СТРАШЭННАЯ ЗАСЬМЕЧАНАСЬЦЬ РАСОНСКАГА РАЁНУ

Расонскі раён, Полацкае округі, пачаў чысьціцца першым.

Здавалася-б, што ў гэтым раёне, які далёка закінуты ад округі і іншых буйных цэнтраў жыцьця, які знаходзіцца сярод лясоў і балот, нельга было чакаць таго, што знайшла камісія па чысткі савецкага апарату.

Пакуль што камісія зрабіла чыстку ўстаноў толькі па пяці сельсаветах з 16-ці ў раёне,—праверыла 80 розных служачых.

Актыўны ўдзел насельніцтва і належная падрыхтаванасьць арганізацый на мясцох далі магчымасьць сапраўды выявіць усё дрэннае і шкоднае ў раённым апараце.

Былыя гандляры, абшарнікі, эксплёататары, кантрабандыстыя—знайшлі тут сабе цёплы прытулак.

Вось букецік і кветкі **Чырвонапольскага спажывецкага таварыства.**

Слоеў М.—браў хабары, за гарэлку даваў любую даведку гандляром—калі быў у сельсавеце. Індывідуальна абкладаўся падаткам. Зараз ён прыказчык, **мае сувязь з гандлярамі і п'янствуе.**

Шмуйловіч З.—былы кантрабандысты, зараз у краме прыказчыкам, **прадае цішком гандляром дэфіцытны тавар.**

Студзянкоў—працуе рахункаводам, былы бандыт, пазбаўлены праў, судзіўся за забойства, **займаецца п'янствам.**

Ня лепш справа ў **Чырвонапольскім лясьніцтве.** Лясьнічы **Кліменценка** за два месяцы давёў лясьніцтва да поўнага разлажэньня. Займаўся п'янствам, хуліганіў ва ўсіх грамадзкіх установах. «Дзень лесу» сарваў, усякую крытыку прыдушваў, трымаў сябе груба і дэспатычна з працаўнікамі.

Трашчанка—працуе лясьніком і зьяўляецца, нажаль, старшынёю рабачкому. Хто ён? Кулак, служыў у Калчака, займаецца п'янствам, замазвае «справы» кулацкіх «дзяльцоў», якія пралезьлі ў лясны апарат.

Чэркас У.—хаця ён былы абшарнік патомствены дваранін, але гэта не перашкаджала яму хавацца ў лясьніцтве лясьніком, працэзьці ў саюз і займацца самагонай справай. Да справы адносіўся наплявацельскі

Крамушчанка П.—лясьнік-заможнік, прапойца і хуліган, арганізатар усіх п'яніц і хуліганаў, перашкаджаў правядзеньню кожнага мерапрыемства прафсаюзу і партыі, за што быў выключаны з саюзу.

Цыцэнка Н.—заможнік, працуе аб'ездчыкам, п'янствуе, груба адносіцца да сялян, мала займаецца сваёй справай.

Амосаў—лясьнік, п'яніца, самагонщык, нядбайна адносіцца да сваёй працы.

Караленка І.—лясьнік, растратчык, давёў свой абход да вялікіх парубак, заможны, захаваў сваё маемаснае становішча, пралез у саюз, быў выключаны за п'янства і іншыя ўчынкі.

Малахаў—лясьнік, нават на чыстку зьявіўся ў п'яным выглядзе, паступіў на работу па пратэкцыі свайго брата рахункавода лясьніцтва, хоць і эьяўляецца заможным.

Грыбоўскі—лясьнік. Дзякуючы яго заўсёднаму п'янству ў абходзе шмат парубак. Аб гэтым яго папярэджвалі, але ён не зьвярнуў ніякай увагі.

Кажамячанка—дзесятнік па дарожным будаўніцтве, былы гандляр і растратчык, п'янствуе, прымае на работу ў першую чаргу заможных, паступіў на работу па пратэкцыі.

Ня лепшыя кветкі знайшліся ў **Гарбачэўскім спажывецкім таварыстве.**

Дразд зцкі—прыказчык гэтага таварыства, былы кантрабандысты, п'янствуе, ашуквае сялян, скажае клясавую лінію, павышае цэны на тавар. Заможнік.

Мэйкстон--таксама былы гандляр, цяпер «спец» па загатоўках, ашуквае сялян на кожным кроку, са сваёй уласнай крамы проста трапіў у савецкую ўстанову, пазбаўлены выбарчых праў.

Буракоў—справавод сельсавету. Прадбачыўшы, што яго вычысьцяць, ён за два дні да прыезду камісіі зволіўся сам, бо ведаў, што за яго ўчынкі—п'янства, растрату, хуліганства, ашуканства сялян —выганяць з савецкай установы.

Шмуйловіч М.—былы гандляр, паступіў на работу па загатоўках, але гэта не перашкаджае яму гандляваць і зараз, ашукваючы сялян пры загатоўках сыр-цу.

Шмуйловіч С.—старшыня Традавіцкага сельсавету, пакрываў гандляроў, якія зьяўляюцца яго сваякамі. Жыве з бацькамі, карыстаецца наемнай рабочай сілай. Пазбаўлены праў. Займаўся цяганінай—на дзень агляду камісіяй выяўлена **200 неразгледжаных сялянскіх заяў.**

Выяўлены і такі тып, як настаўнік школы Традавіцкага сельсавету **Жураўскі,** які выкладаў дзецям псалмы, імпны і г. д.

Амаль усе яны зьняты з работы. Цікава—куды глядзелі вочы расонскіх кіраўнікоў?

Л. Б.

БЕДНАТА ДАПАМАГЛА У ЧЫСТЦЫ

У Нараўлянскім раёне (Мазырчына) пачалася чыстка савецкага апарату. Актыўнасьць прафсаюзных мас і бяднякова-сераднякага сялянства надзвычайна вялікая.

Пры абсьледваньні Нараўлянскага спажывецкага таварыства выявілася, што лішэнцы, як і ўсе працоўныя маюць членскія кніжкі і карыстаюцца ўсімі правамі пайшчыкаў. Сярод самога апарату таварыства адчуваецца сямейнасьць, нежаданьне выкрыць чужых, пралезных у апарат, і свае недахопы. А недахопаў шмат. Нярэдкі і зараз выпадкі пратэкцыянізму пры выдачы дэфіцытных тавараў.

Прафсаюзныя і асабліва бяднякова-сераднякія масы дзелавіта рэагуюць на ўсе гэтыя недахопы, яны адкрыта выцяўляюць твар тых супрацоўнікаў, якія груба, бюракратычна адносяцца да пакупцоў. Асабліва гэта паказалі праверачныя сходы ў вёсцы Дзярновічы, дзе беднота і серадняк ва ўпор ставілі пытаньне перад некаторымі служачымі таварыства—«такі нам не патрэбны ў каапэрацыі, ён яшчэ ня зжыў спэкулянскія выхадкі, любіць ашукаць селяніна».

Чысткa ў вёсцы паказала яшчэ тое, што селянін надта цьвяроза, правільна падыходзіць да гэтага пытаньня.

— Мы цябе даем—кажуць сяляне—за твае недахопы, але працаваць ты можаш, і мы просім камісію пакінуць цябе на працы (гэта адносна старшыні Дзярновіцкага таварыства).

Такі падыход да чысткі з боку бяднякова-сераднякіх мас сялянства забясьпечвае правільнае правядзеньне гэтай важнейшай задачы.

Б. Ш.

ВЫНІКІ ЧЫСТКІ БАБРУЙСКАГА АКРСТАТБЮРО

Скончыла сваю працу камісія па чысткі апарату Бабруйскага акрстатбюро. Праверку прайшло 25 супрацоўнікаў. Зьнімаюцца з працы 5 чалавек. Хто яны?

Прышчэпчык Уладзімер, агент па зьбіраньні вестак аб пэнах. Ён служыў афіцэрам у старой арміі, пасьля ўтойваў, што ён прызнаўся. У тойвае, што служыў афіцэрам у Дзянікіна. У часе белапалякаў хадзіў у пагонах і з шаблай. Напісаў у паслужным сьпісе, што мае ніжэйшую асьвету і паступіў у школу прапаршчыкаў пасьля экзамену, на справе-ж служыў у арміі радавым, адкуль пайшоў у школу прапаршчыкаў, як скончыўшы гарадзкое вучылішча.

Казючыц Уладзімер—былы загадчык акрстатбюро, быў чыноўнікам і даслужыўся да сакратара Саратаўскага «губэрскага вайсковага прысутсьтвія». Мае сувязь з братамі самагоншчыкамі, з замешаным у шпіянажы шваграм—кулаком. Лічыцца членам гэтай сям'і аб чым прадставіў і даведку ад сельсавету. Калі быў на вёсцы настаўнікам, ішоў за адно з кулакамі, зрываў сходы сялян. Напрымаў на працу розных «былых» людзей, а прысланых камуністых не хацеў уводзіць у курс спраў. Розныя весткі марынаваў у партфэлі, чым тармазіў тэрміновыя працы рэспубліканскага машштабу.

Іваноў Нікан—служыў да палякаў у крымвышуку, а пры паляках у іхняй паліцыі, арыштоўваў камуністых. Пры ўваходзе чырвоных папаў у канцэнтрацыйны лягер, але па прадстаўленьні даведак (іх камісія лічыць сумленнымі) быў вызвален. Не парваў сувязі з былымі людзьмі: жонка яго—сястра тэарыстага Кур'яна, які рабіў замах на старшыню павятовага выканкома т. Малаковіча.

Бельскі Канстанцін, сакратар-бухгальтар. Былы чыноўнік старой арміі, у Чырвонай арміі ня служыў. У акрсельсаюзе быў зьняты з працы, як непадсейны. Да працы адносіцца фармальна, бюракратычна. Меў вымову ад групкому за антысэмітызм. Палітычна няпісьменны, ня ведае сутнасьці нацыяліцтві, ад чаго і сам не адмаўляецца. Можа быць на працы толькі на тэхнічных не адказных пасадах у іншых установах.

Вечар Уладзімер—былы член акруговага суду ў Сібіры, пры Калчаку быў членам Іркуцкай судовай палаты. Як загадчык сэкцыі сельска-гаспадарчай статыстыкі не адпавядае. Ён зусім слаба арыентуецца ў савецкай сучаснасьці, палітычна няпісьменны, гэта мае адбітак на працы сэкцыі, асабліва важнай у сучасны момант. Дазваляецца яму працаваць на тэхнічных пасадах у іншых установах.

Правяраючы старшага статыстыка **Чаплёва,** камісія парашыла яго пакінуць на працы з тым, каб у месячны тэрмін ён прадставіў даведкі аб працы і жыхарстве ў **1917-18 гадох.**

Шчотчыку Хінічу, статыстыкам **Пагадыцкай і Кастадыцкай** вынесена папярэджаньне за няўважлівасьць і фармальныя адносіны да працы.

У апараце акрстатбюро ёсьць шмат працаўнікоў, якія сумленна адносяцца да працы, яны актыўна дапамагалі камісіі ў яе працы па праверцы апарату. Гэтаму-ж дапамагалі шмат і заявы сялян аб некаторых, што здымаюцца цяпер з працы.

Ш.

Аб аднэй няўвязцы

Ёсьць установы, дзе працаўнікі аб'ядноўцца двума саюзамі—сельгаслесарабочых і працасьветы. Такімі ўстановамі зьяўляюцца дасьледчыя станцыі навукова-дасьледчага інстытуту імя Леніна і некаторыя с.-г. школы.

Усе рабочыя, як правіла, аб'ядноўцца саюзам сельгаслесарабочых, а працаўнікі спэцыялістыя—саюзам працасьветы.

У выніку — шмат ненармальных зьявішч. Працаўнікі, якія знаходзяцца ў саюзе працасьветы, ня хочуць лічыцца з думкай рабочых і наадварот. Калі наладжваюцца сходы, дык адны да другіх ня ходзяць, лічаць, што гэта «ня наш саюз».

Калі запыталі спэцыялістага с.-г. фэрмы Эдэльмана, які вы прынялі ўдзел у пасеўкампаніі, дык атрымалі адказ: «я ў саюзе працасьветы, а гэта справа саюзу сельгаслесарабочых, таму мною нічога не рабілася». Так адказвае агранам.

Рабачкомы пры сваёй няпісьменнасьці ня могуць наладзіць культработы. Спэцыялістыя—члены саюзу працасьветы—культурная сіла, але ня лічаць патрэбным дапамагаць рабочым саюзу сельгаслесарабочых. На тэй-жа фэрме Эдэльмана, дзе ёсьць 7 спэцыялістых, і 9 чалавек рабочых значная частка няпісьменных ці малапісьменных, ніколі ў вёсцы не ставіцца пытаньне аб ліквідацыі няпісьменнасьці.

У артыкулах падкрэсьліваецца, што бюджэтныя асыгнаваньні ўраду далёка невыстарчальныя, каб хуткім тэмпам ліквідаваць няпісьменнасьць. Толькі актыўны ўдзел савецкай грамадзкасьці ў ліквідацыі няпісьменнасьці можа дапамагчы з посьпехам выканаць тыя задачы, што стаяць перад рабоча-сялянскай краінай на гэтым вучастку культурнага фронту. Навучальны год ужо на парозе. На мясцох зараз распачынаецца падрыхтоўка да пачатку заняткаў як у школах, так і ў лікпунктах. Задача ўсяе савецкае грамадзкасьці — прыняць актыўны ўдзел у распачатай справе—сацыялістычным спаборніцтве за лепшую падрыхтоўку да пачатку навучальнага году, за лепшае абслугоўваньне лікпунктамі рабочага, батрака, бедняка селяніна, калгасьніка.

Перад кожным савецкім грамадзянінам ставіцца задача — пісьменны навучы няпісьменнага.

Мабілізацыя ўнутраных рэсурсаў усё яшчэ на паперы

«Рабочий» у нумары ад 2 ліпеня прыводзіць даныя сваёй вызнной рэдакцыі ў Віцебску аб абураючых адносінах да мабілізацыі цэнтральных рэсурсаў прамысловасьці. Аказваецца, што са складаў заводу «Чырвоны Мэталісты» можна здабыць мэталяў на паўмільёна рублёў. Загад аб мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў знаходзіцца пад сукном.

Прыведзеныя даныя яскрава сьведчаць, наколькі яшчэ шмат можна зрабіць у гэтай галіне. Зусім нядаўна «Зьвязда» адзначала, што ў справу мабілізацыі рэсурсаў прамысловасьці ня ўцягнута рабочая грамадзкасьць. Факт, аб якім расказвае «Рабочий», мог мець месца толькі дзякуючы таму, што ня была ўзбуджана актыўнасьць рабочых заводу «Чырвоны Мэталісты».

Вынікі тэатральнага сэзону

«Савецкая Беларусь» (№ 147) у артыкуле т. **Ал. Некрашэвіча** падагульвае вынікі мінулага тэатральнага сэзону. Пытаньне — даволі важнае і цікавае, прымаючы пад увагу, што пачатак тэатральнага сэзону вызначыўся, як вядома, досыць такі ажыўленымі спрэчкамі аб шляхох нашага тэатру.

Тав. Ал. Некрашэвіч правільна падкрэсьлівае неабходнасьць і ў далейшым ісьці па шляху стварэньня тэатрам свайго арыгінальнага твару. Аўтар папярэджвае нашы беларускія тэатры ад небясьпекі рабскага перайманьня ад другіх тэатраў, а таксама і ад правінцыялізму. На жаль, аўтар артыкулу **не** завастрае ўвагі на другой небясьпецы — на **магчымасьці** прасочваньня **нацыяналістычнай ідэалёгіі** ў мастацкую работу тэатраў.

БССР у 1929-30 г.г. атрымае звыш 900 аўтамашын

Трэба падрыхтавацца да аўтамабілізацыі БССР

Аўтатранспарт БССР на сёньняшні дзень вельмі нязначны і наліччае ўсяго каля 250 адзінак, з якіх значная частка папсавана. Такая колькасьць аўтамашын ні ў якім разе ня можа задаволіць значна вырасшую патрэбу ў замене гужавога транспарту мэханічным. Далейшае разьвіцьцё нашае гаспадаркі немагчыма без аўтамабілю, ня прыходзіцца таксама думаць аб тым, каб без аўтатранспарту наладзіць культурнае абслугоўваньне вёскі.

Аўтамабіль ужываецца ва ўсіх галінах народнае гаспадаркі. Попце аўтамабіль стаў таксама неабходным, як паштальён, трэба забыцца аб першабытным мэтадзе перавозкі карэспандэнцый на конях. Аўтамабіль трэба ўкараніць у службу сувязі.

Камунальная гаспадарцы аўтамабіль прыносіць вялікую дапамогу. За мяжой ужо даўно ўжываецца аўтатранспарт для паліўкі вуліц, ачысткі сьмяцьцёвых і выграбных ям, для абслугоўваньня будаўнічых работ і г. д.

Ня прыходзіцца гаварыць аб значэньні аўтамабілю ў процілапажарнай ахове гарадоў, у галіне санітарнага абслугоўваньня і, нарэшце, як сродку абслугоўваньня спажывецкае каапэрацыі і нашых загатоўчых органаў.

Пытаньне аб неабходнасьці аўтамабілізацыі пастаўлена зараз ва ўсю шырыню. Цяпер мы ўжо маем рэальныя вынікі гэтае кампаніі. Пастанова ўраду аб пабудове ў Н.-Ноўгарадзе аўтамабільнага заводу, разьлічанага на штогадовы выпуск 100.000 аўтамабіляў, умова з Фордам — гарантуе нам, што аўтамабілізацыя краіны пойдзе ўперад хуткім тэмпам.

Па апошніх даных, за 1929-30 г. Беларусь павінна атрымаць 250 легкавых аўтамабіляў, каля 600 грузавікоў маркі «Форд», 30 шт. «АМО», 30 цяжкіх грузавікоў Яраслаўскага заводу і 60 матацыклаў.

Ужо цяпер узьнікае задача разьмеркаваньня гэтае першае колькасьці аўтамабіляў. Нашы гаспадарчыя арганізацыі яшчэ не выпрацавалі пляну ўжываньня аўтатранспарту на прадпрыемствах. Белсельтрэст, Белсельсаюз і Белкаапсаюз амаль што зусім ня думаюць аб тым, як забясьпечыць аўтамабілямі нізавую сетку каапэрацыі, саўгасы, камуны, калгасы і г. д. У Амэрыцы аўтамабіль ужываецца ў кожнай фэрмэрскай гаспадарцы; зусім ясна, што для нашых саўгасаў і калгасаў ён таксама неабходны.

Найбольш вострае пытаньне — падрыхтоўка неабходнага кадру шофэраў машын. Аўтадор на сваіх кароткатэрміновых курсах у бягучым годзе падрыхтоўвае каля 250 членаў таварыства, але гэтага вельмі мала. Наркамасьветы павінен у бягучым-жа годзе адкрыць аўташколу прафтэхнічнага тыпу. Трэба забясьпечыць гэту школу неабходным інвэнтаром і лепшым пэдагагічным пэрсаналам.

Неабходна будзе таксама падумаць над пытаньнем **пабудовы ў акруговых цэнтрах грамадзкіх гаражоў.** Паколькі маркі машын аднатыпныя, няма сэнсу, каб пры кожным прадпрыемстве ў горадзе быў свой гараж. Буйныя гаражы патаняюць трыманьне аўтамабіляў, даюць лепшыя магчымасьці рэмонту.

Нафтасындыкату неабходна будзе ў найбольш ажыўленых мясцох паставіць бэнзынавыя калёнкі.

Урэшце, для будучых аўтамабіляў трэба падрыхтаваць добрую дарогу. Гэтым павінны заняцца ячэйкі і арганізацыі аўтадору на мясцох.

КЛЮЧЫНСКІ.

Сацыялістычная рацыяналізацыя--

база далейшага разьвіцьця сацыялістычнага будаўніцтва

Інжынэрна-тэхнічныя работнікі павінны дапамагчы рабочым, якія актыўна ўдзельнічаюць у паляпшэньні нашае вытворчасьці.—Укараніць асноўныя вытворча-тэхнічныя веды ў рабочыя масы.—Практычна дапамагчы рабочым-вынаходцам

Тэмп тэхнічнага пераабсталяваньня нашай прамысловасьці зьяўляецца вырашальным па сваім размаху. Пэрспэктыўны плян разьвіцьця прамысловасьці, сельскае гаспадаркі, транспарту і іншых сэктараў нашае гаспадаркі прадугледжвае сапраўды гіганцкі рух наперад, якога ня ведае сусьветная гаспадарка. Плян «вялікіх работ», які знайшоў сваё адлюстраваньне ў кантрольных лічбах на бліжэйшае пяцігодзьдзе, павінен быць ажыцьцёўлены за кошт унутраных накапленьняў і магчымасьцяй. Гэтыя накапленьні і гэтыя магчымасьці павінны з году ў год павялічвацца і забясьпечыць рэальнасьць нашага росту і ўзятага маштабу нашага сацыялістычнага будаўніцтва.

Адным з момантаў, што забясьпечвае гэтыя магчымасьці, зьяўляецца шырокая сацыялістычная рацыяналізацыя на ўсіх вучастках нашае гаспадаркі. Сацыялістычная рацыяналізацыя павінна быць тэй базай, на якой могуць нарастаць нашы магчымасьці па шырокай тэхнічнай рэканструкцыі.

Рацыяналізацыя і рэканструкцыя—такія шляхі, якія могуць вырашыць праблемы тэмпу нашага разьвіцьця.

І той і другі шлях надзвычайна складаны і патрабуе вялічэзнага напружаньня ўсіх сіл краіны. З гэтымі шляхамі мы фактычна сутыкаемся на любым вучастку нашае гаспадаркі, на любым прадпрыемстве.

Практыка работы вытворча-тэхнічных нарад на паасобных прадпрыемствах паказала вялікую зацікаўленасьць рабочай масы ў пытаньнях рацыяналізацыі вытворчасьці, паляпшэньня якасьці прадукцыі і г. д. Але гэта буйная работа часта праводзіцца з вялікай тратай энэргіі, сіл і часу і характарызуецца часамі адсутнасьцю стройнага пляну. У радзе выпадкаў рабочаму не пад сілу рабіць складаныя аналізы, асабліва тэхнічныя, што адносяцца да разбору тых або іншых пытаньняў. А цэнтр цяжару зараз ляжыць нястолькі ў колькасных паказальніках работы прадпрыемства, колькі ў якасных яе паказальніках—тэхніка-эканамічных, у правядзеньні плянавай шырокай рацыяналізацыі.

У гэтых выпадках інжынэрна-тэхнічныя работнікі і ячэйкі ІТС на прадпрыемствах, як на прафэсыянальна-арганізацыйнае ядро ў цэлым, павінны прыйсьці на дапамогу рабочым, якія актыўна ўдзельнічаюць у паляпшэньні нашае гаспадаркі.

Інжынэрна-тэхнічная сэкцыя павінна зьявіцца арганізуючым пачаткам ва ўсёй гэтай эканомрабоце,—бо ІТС зьяўляецца фактычна найбольш кваліфікаванай часткай усіх працоўных на прадпрыемстве, з вялікімі тэхнічнымі ведамі і вытворча-арганізацыйнымі навыкамі. Асабліва трэба вынукліць пытаньні вытворчай прапаганды і вытворчае асьветы. Рабочыя ў сваёй пераважнай масе невыстарчальна ведаюць тэхналёгію сваёй вытворчасьці і нават тых працэсаў, да якіх яны «прыстасўлены». Яны ня ведаюць у належнай ступені асаблівасьцяй і сэнсу гэтых працэсаў, існуючых і новых мэтадаў апрацоўкі, ня ведаюць сваіх варштатаў, іх канструкцыі, магчымай хуткасьці і г. д. Ці могуць гэтыя рабочыя—асабліва маладыя рабочыя на данай вытворчасьці—пры наяўнасьці невыстарчальных навыкаў і паказаных вышэй ведаў сьвядома працаваць, скажам, для паляпшэньня якасьці прадукцыі? У гэтых адносінах павінна быць праведзена буйная работа ня толькі ў напрамку інструктаваньня рабочых з боку старшых і зьменных майстроў, складаньня для іх адпаведных інструкцыйных картак і г. д. Гэта мае ў сабе ў значнай ступені элемэнты адміністрацыйных функцый. Пытаньне павінна ставіцца шырэй: укараніць мінімальныя вытворча-тэхнічныя веды ў рабочыя масы, каб для іх мог стаць зразумелым сэнс гэтых інструкцый, каб яны маглі тэхнічна разабрацца ў іх.

Гэта работа павінна цалкам лажыцца на інжынэрна-тэхнічныя сэкцыі адпаведнай прафэсыянальнай арганізацыі. Ніхто іншы, як яны, ня ў стане даць рабочаму патрэбныя яму ведаў і павысіць яго «тэхнічную культуру».

Гэты фронт мае патрэбу ў значным падмацаваньні. На ім, на наш погляд, павінна разгарнуцца іменна тая культурная работа, якая мае непасрэдную сувязь з агульнай вытворча-эканамічнай работай на прадпрыемстве.

На долю ІТС прыпадае яшчэ буйная задача, зьвязаная з правядзеньнем у жыцьцё ўрадовай дырэктывы аб увядзеньні на ўсіх прадпрыемствах 7-гадзіннага рабочага дня ў працягу бліжэйшага пяцігодзьдзя. Тут патрэбна масавая прапрацоўка гэтага пытаньня. Агульнымі намаганьнямі трэба прааналізаваць і прапрацаваць усе ўмовы, якія забясьпечваюць магчымасьць найхутчэйшага і бесьпярашкоднага—з пункта гэтага ў прамысловасьці ў цэлым—пераходу на 7-гадзінны рабочы дзень, забясьпячэньня належнай прадукцыйнасьці працы, належнай арганізацыі і ўвязкі вытворчых і працоўных працэсаў, захаваньня найбольш адпавядаючага інтарэсам рабочых і прадпрыемства распарадку работы і г. д.

Невыстарчальны, памойму, удзел ІТС у пытаньнях вынаходніцтва. Справа ня толькі ў абавязковым удзеле ІТС у экспэртных камісіях па вынаходніцтве, арганізаваных на прадпрыемствах або ў трэстах. Гэта ў пэўнай меры фармальны бок справы. Трэба і ў гэтай галіне пераварыць сваю практыку, веды і навыкі ў практычную дапамогу вынаходцам шляхам аказаньня ім тэхнічнай кансультацыі і г. д. Можна ісьці і далей: трэба накіраваць работу рабочых-вынаходцаў у тое рэчышча, якое павінна прывесьці да тых, або іншых вытворчых мэт і эфэкту, можна ў пэўнай меры даць гэтым вынаходцам матар'ял для сваёй творчасьці, у відзе пэўных канкрэтных заданьняў. Практыка вынаходніцкае справы заграніцай, дзе вынаходцы ў радзе выпадкаў працуюць «на заказ», паказала поўную жыцьцёвасьць і мэтазгоднасьць гэтых мэтадаў работы.

Некалькі слоў аб вылучэньстве. Ва ўсім СССР адбываецца зараз вылучэньне новых кадраў работнікаў на розныя камандныя пасады. Рабочыя вылучаюцца на адказную адміністрацыйную работу, малады кадр спэцыялістых вылучаецца на розныя работы па тэхнічным кіраўніцтве. І тыя і другія павінны спаткаць з боку ІТС максымальнае падтрыманьне ў сэнсе аказаньня дапамогі для аўладаньня ўсімі патрэбнымі адміністрацыйна-тэхнічнымі і арганізацыйнымі навыкамі і г. д.

Інжынэрна-тэхнічныя сэкцыі павінны зусім выразна паставіць перад сабой сваю практычную работу і больш цесна зьвязацца з усім актывам рабочых на кожным прадпрыемстве. Трэба, каб і такія пытаньні, як экспэртызы (або заключэньні) па капітальным будаўніцтве, разгляд прамфінплянаў, разбор пэрспэктыўных плянаў і г. д. праводзіліся на пасяджэньнях ІТС не ў габінэце, а на самым прадпрыемстве. Ніхай там—блізка да варштату і рабочага, пры непасрэдным удзеле апошняга—вырашаюцца пытаньні напала пераможнага руху на шляху сацыялістычнага будаўніцтва краіны.

Зусім ясна, што адасобленасьці паміж рабочай масай і яе найбольш кваліфікаванай часткі—ІТС—не павінна быць месца. Прафсаюзы—у першую чаргу—павінны весьці барацьбу е выпадкамі спэцадзтва, што ёсьць яшчэ на тым або іншым прадпрыемстве.

Трэба стварыць адпаведныя ўмовы—адпаведную дзелавую і таварыскую атмасфэру для цеснага супрацоўніцтва і калектывізацыі творчасьці.

Інж. Г. ФРЫД.

АГЛЯД БЕЛАРУСКАГА ДРУКУ

Пісьменны навучыць няпісьменнага

Менскія газэты ва ўчарайшым нумары ў сувязі з пабліжэньнем новага навучальнага году шмат вызначылі месца пытаньням ліквідацыі няпісьменнасьці.

У артыкулах падкрэсьліваецца, што бюджэтныя асыгнаваньні ўраду далёка невыстарчальныя, каб хуткім тэмпам ліквідаваць няпісьменнасьць. Толькі актыўны ўдзел савецкай грамадзкасьці ў ліквідацыі няпісьменнасьці можа дапамагчы з посьпехам выканаць тыя задачы, што стаяць перад рабоча-сялянскай краінай на гэтым вучастку культурнага фронту. Навучальны год ужо на парозе. На мясцох зараз распачынаецца падрыхтоўка да пачатку заняткаў як у школах, так і ў лікпунктах. Задача ўсяе савецкае грамадзкасьці — прыняць актыўны ўдзел у распачатай справе—сацыялістычным спаборніцтве за лепшую падрыхтоўку да пачатку навучальнага году, за лепшае абслугоўваньне лікпунктамі рабочага, батрака, бедняка селяніна, калгасьніка.

Перад кожным савецкім грамадзянінам ставіцца задача — пісьменны навучы няпісьменнага.

Вынікі тэатральнага сэзону

«Савецкая Беларусь» (№ 147) у артыкуле т. **Ал. Некрашэвіча** падагульвае вынікі мінулага тэатральнага сэзону. Пытаньне — даволі важнае і цікавае, прымаючы пад увагу, што пачатак тэатральнага сэзону вызначыўся, як вядома, досыць такі ажыўленымі спрэчкамі аб шляхох нашага тэатру.

Тав. Ал. Некрашэвіч правільна падкрэсьлівае неабходнасьць і ў далейшым ісьці па шляху стварэньня тэатрам свайго арыгінальнага твару. Аўтар папярэджвае нашы беларускія тэатры ад небясьпекі рабскага перайманьня ад другіх тэатраў, а таксама і ад правінцыялізму. На жаль, аўтар артыкулу **не** завастрае ўвагі на другой небясьпецы — на **магчымасьці** прасочваньня **нацыяналістычнай ідэалёгіі** ў мастацкую работу тэатраў.

„Цывілізаваныя каапэратары"

Кантрактацыя—пытаньне вельмі важне і сур'ёзнае. Кантрактацыя гаранце збыт лішкаў прадукцыі на лініі г. капэрацыі і забясьпечвае прамысвасьць сырцом. Шляхам авансаў і розных агрыкультурных мерапрыемваў кантрактацыя паднімае ўзровень ськае гаспадаркі і павышае яе прыытковасьць.

Здавалася-б, што ўсе гэтыя элемэнтарныя ісьціны павінен быў усьвядоміць гомельскі садсаюз, які таксама праводзіць кантрактацыю.

У сапраўднасьці пытаньне ня так стаіць. Гомельскі садсаюз, які на 99 проц. трымаецца на прадукцыі калгасаў, зусім забыў, што ён зьяўляецца каапэрацыйнай арганізацыяй і закліканы паднімаць садовую гаспадарку округі, асабліва калгасаў. Замест гэтага садсаюз стаў на сьлізкі шлях гандлю.

Зусім ня ўвязваючы сваёй работы з акруговым калгассаюзам, гомсадсаюз распрацоўвае дагавор на кантрактацыю садовай плошчы ў калгасах, паводле якога абавязвае калгасы ўтрымліваць сады ў парадку, правільна сартаваць іх і пры ўпакоўцы, хаваць у добрых месцах, застрахаваць ад градабіцьця і г. д. і г. д. У дадатак да гэтых абавязацельстваў калгас павінен таксама аплаціць камісійных 15 проц., з якіх раённыя садовыя таварыствы атрымліваюць 7 проц., гомсадсаюз—5 проц. і Белсельсаюз—3 проц. Пры гэтым у выпадку неўраджаю ці стыхійнай бяды калгас павінен вярнуць узяты ім аванс у 5-цідзенны тэрмін з налічэньнем банкаўскіх процантаў за ўвесь час карыстаньня ім.

Якія-ж абавязкі бярэ на сябе гомсадсаюз у адносінах да калгасу? Ніякіх. Дагавор не прадугледжвае сваячасовай прыёмкі садавіны, сваячасовых разрахункаў за іх і г. д.

Паўстае пытаньне, за што плаціць 15 проц. камісійных? За тое, каб фрукты, як у мінулым годзе, гнілі на складах?

Усё гэта лішні раз гаворыць за тое, што мы здолеем забясьпечыць правільнае гаспадарчае абслугоўваньне калгасаў пры ўмове, калі калгасным саюзам будуць паданы апэрацыйныя функцыі. Тады калгассаюзы будуць зацікаўлены ў выгодным збыце калгаснай прадукцыі і іх забясьпячэньні. І тады гэта справа будзе выключана з гандлёвых арганізацый, якія больш за ўсё зацікаўлены ў атрыманьні ліхвярскіх процантаў. Да таго часу, пакуль апэрацыйна-гаспадарчыя функцыі ня будуць пераданы калгасным саюзам, мы заўсёды будзем сутыкацца з такімі ненармальнасьцямі.

Ц.

На Савецкай Беларусі

Рыхтуемся да асеньняй сяўбы

БАБРУЙСК. (Наш кар.). Веснавая сяўба скончана. Ужо час пачаць падрыхтоўку да асеньняй сяўбы.

Асабліва гэта павінны запамятаць камітэты сялянскай узаемадапамогі, якія ў значнай частцы амаль што нічога не зрабілі для дапамогі беднаце ў часе веснавой пасеўнай кампаніі. А некаторыя сельсаветы, як напрыклад, Кавалеўскі нават адмовіліся даць гужавую дапамогу беднаце, матывуючы тым, што бядняк гэта гультай. Таму нашым камітэтам сялянскай узаемадапамогі трэба зараз узяцца за справу па забесьпячэньні вясковай беднаты насеньнем, угнаеньнем, гужавой дапамогай шляхам арганізацыі працужарцеляй і конных калён.

Увосень мяркуецца па Бабруйшчыне заваяваць 3.800 гэктараў. У зьвязку з гэтым у акрузе пачата пабудова 10 ваннавых млыноў. Значнае месца займае ў пляне асеньняй пасеўнай кампаніі да гатоўка насеньня і ўгнаеньня і забесьпячэньне вёскі с.-г. машынамі. Загатоўчыя арганізацыі ўжо прыступаюць да загатовак арганізацыі.

Апрача таго мяркуецца правесьці пасеў гатуновым пасевам жыта на плошчы ў 1.400 гэктараў і ішаніцы на плошчы ў 1.010 гэктараў.

З кожным годам пашыраецца ўжываньне торфу на ўгнаеньне. У асеньнюю пасеўную кампанію торф пойдзе яшчэ ў большай колькасьці. Для папулярызацыі сярод сялян гэтае справы ў асеньнюю пасеўную кампанію мяркуецца залажыць 73 паказальныя вучасткі на тарфяным угнаеньні. Будуць арганізаваны дзесяткі новых тарфяных таварыстваў.

У акрузе пачалася ўжо кантрактацыя пасеваў азіміны. У гэтым годзе вызначана закантрактаваць да 9 тысяч гэктараў.

У галіне падняцьця ўраджайнасьці адным з самых спрыяючых мерапрыемстваў гэтай справы зьяўляецца ачыстка насеньня. Мяркуецца ачысьціць да пасеву 60 проц. усяго насеньня. Каб выканаць гэтае заданьне, трэба зараз-жа пачаць ачыстку насеньня. Пасеўная плошча пад азімыя пасевы будзе павялічана на 4.711 гэктараў, або на 2,2 проц.

Пачатае сацыялістычнае спаборніцтва паміж вёскамі, калгасамі, саўгасамі павінна разгарнуцца ў часе падрыхтоўкі да асеньняй сяўбы.

Ч.

Бабруйшчына рыхтуецца да дня каапэрацыі

БАБРУЙСК. (Наш кар.). Каапэрацыя Бабруйшчыны рыхтуецца да дня каапэрацыі. Сьвяткаваньне пройдзе пад лёзунгамі: 100 проц. каапэраваньне бяднацкай масы і шырокая калектывізацыя сялянскіх гаспадарак. Сельска-гаспадарчая каапэрацыя паставіла перад кожным таварыствам задачу ўцягнуць ня менш як 30 сялянскіх гаспадарак. Такім чынам, па ўсёй акрузе павінна быць каапэравана да 1.200 двароў. Спажывецкая каапэрацыя на справу каапэраваньня адпушчае 5 проц. сваіх чыстых прыбыткаў. Апрача таго для шырокага каапэраваньня беднаты будуць цалкам скарыстаны вызначаныя для гэтай мэты, але нескарыстаныя сродкі ў суме 19 тысяч руб.

Дзень каапэрацыі спажывецкая каапэрацыя адзначае адчыненьнем 12 ясьляў-пляцовак для дзяцей членаў калгасаў.

У дзень сьвята будуць праведзены ў Жлобіне, Рагачове і Парычах карнавалы каапэрацыі. Апрача таго ў Жлобіне і Парычах арганізоўваюцца кніжныя рынкі, дзе будзе прадавацца літаратура галоўным чынам каапэрацыйная са скідкай у 10 проц.

Ч.

Жыльлёвае будаўніцтва на Асінбудзе

АСІНБУД. (Наш кар.). Праграма жыльбудаўніцтва на Асінбудзе, якая прадугледжвае выдатканьне 2.500.000 руб., будзе скончана ў 1930-31 г.

**Пасёлак у в. Арахі будуецца па тыпе ўпарадкаванага гораду. Амаль уся будоўля—трохпавярхов

Да міжнароднага чырвонага дня

Менакругком МОПР'у распрацаваў дэтальны план удзелу мопраўскіх раённых арганізацый і ячэек МОПР'у ў міжнародным чырвоным дні (1-га жніўня).

Асаблівая ўвага зьвернута на шырокае растлумачэньне рабочым і сялянам ваеннай небясьпекі в боку імпэрыялістычных дзяржаў і ўдзелу ў палітыцы імпэрыялістых сацыял-здраўнікаў з 2-га Інтэрнацыялу.

Па ўсіх ячэйках МОПР'у напярэдадні 1-га жніўня ў абедзеных перапынкі або пасьля работы будуць праведзены ўпаміны аб імпэрыялістычнай вайне 1914-18 г. і гутаркі аб інтэрнацыянальнай братэрскай салідарнасьці рабочае класы.

У дзень 1-га жніўня мопраўскія арганізацыі наладжваюць масавыя дэманстрацыі рабочых і працоўных сялян з лёзунгамі супроць вайны і нападу на савецкую краіну. Рыхтуецца таксама валікі карнавал з удзелам артыстых дзяржтэатру і дзяржцырку.

Для прыняцьця ўдзелу ў правядзеньні міжнароднага чырвонага дня прыедуць у Менск прадстаўнікі выканкому Камінтэрну і МОПР'у--тав. Камароў і дачка Благоева.

Гэтымі дня ні будзе склікана агульнагарадзкая нарада Менскага актыву МОПР'у, дзе будзе абгаворвацца план удзелу МОПР'у ў дні 1-га жніўня.

Ц.

Сталоўкі для рабочых ці наадварот?

Прыходзіцца зноў варочацца да гэтага пытаньня. Кожную раніцу а 8 г. можна убачыць вялікія чаргі людзей каля сталовак № 3 і № 8. Гэтыя людзі чакаюць адчыненьня сталовак, каб паесьці перад тым, як пайсьці на службу. Сталоўка № 8 павінна, згодна існуючых правіл, адчыняцца роўна а 8 гадзіне. Фактычна-ж яна адчыняецца а 8 гадз. 15 хв. або яшчэ пазьней. Людзі стаяць чакаюць, нэрвуюцца, бо трэба-ж сваячасова папасьці на службу.

Яшчэ ўчора можна было наглядаць такі малюнак каля сталоўкі № 8. А 8 гадз. 20 хв. яе адчынілі. Натоўп ўрываецца ў памяшканьне. Каля буфэту зноў выстрайваецца чарга. Буфэтчыца вельмі павольна адпускае квіткі і яду. Пакуль да цябе дойдзе чарга, пройдзе яшчэ 15 хв. Трэба яшчэ хвілін 10 патрацыць на яду. Такім чынам на службу сваячасова і не пасьпееш.

Трэба гэткае становішча ліквідаваць і дапасаваць працу сталовак раніцою да патрэб наведвальнікаў, а не наадварот. Трэба, каб ня толькі сталоўка № 8, але і іншыя адчыняліся роўна а 8 гадзіне бяз усякага спазьненьня. Акрамя таго, раніцою за буфэтам павінен працаваць не адзін чалавек, а два.

Х.

Ці патрэбен цырк рабочаму глядачу

(На дыспуце ў садзе друкароў)

Дыспут аб цырку выклікаў вялікую зацікаўленасьць менскіх рабочых. Памяшканьне летняга клюбу друкароў у часе дыспуту было перапоўнена.

З дакладам аб пэрспэктывах разьвіцьця цыркавога мастацтва выступіў дырэктар кіраўніцтва дзяржцыркамі т. Вальдман. У сваёй прамове т. Вальдман падкрэсьліў, што рабочы цікавіцца цыркам, што ў Менску трэба пабудаваць спэцыяльны будынак для цырку.

Даклад тав. Вальдмана выклікаў гарачыя спрэчкі.

Рабочы майстэрні Белдзяржвыдавецтва Левін лічыць, што цырк зьяўляецца мастацтвам масавым. Рабочым вельмі спадабаецца цыркавая праграма. Розьніца паміж старым прыватна-ўласьніцкім цыркам і новым, савецкім, вялізарная.

— Цырк,—кажа рабочы Скарбо,—нам патрэбен. Ён паказвае, якіх вынікаў можна дасягнуць пры доўгай трэніроўцы цела.

— Трэба палепшыць у цырку размоўны жанр,—кажа рабочы Танэнбаум. Самакрытыка, здаровая сатыра павінны знайсьці сабе пачэснае месца ў праграме цырку.

— Кіно і цырк,—заявіў дырэктар Белдзяржкіно т. Галкін,—зьяўляюцца роднымі братамі, самымі дэмакратычнымі відамі мастацтва.

Усе выступленьні амаль аднагалосна прызналі неабходнасьць мабілізаваць грамадзкую думку вакол пытаньня аб пабудове цырку ў Менску.

Закладка „Дому Ўраду“

Закладка будынку «Дому Ўраду» прыстасавана да 11 ліпеня—9-й гадавіны вызваленьня Беларусі ад белапалякаў.

Уся плошча, прызначаная для пабудовы, ужо ачышчана ад будынкаў. Выселена з 50-ці дамоў 225 чалавек, якім прадастаўлены кватэры. Да месца пабудовы ўжо падвозіцца будаўнічы матар'ял, цэмэнт, пясок і каменьне. Земляныя работы пачнуцца 15-га жніўня. У бягучым годзе будзе пабудаваны толькі цокальны паверх. 5-га ліпеня апошні тэрмін падачы праектаў будынку, 10-11 ліпеня пачнецца разгляд праектаў конкурснай камісіяй.

СПОРТ

Зарадкавая гімнастыка на прадпрыемствах

На фізкультурнай нарадзе пры ЦСПСБ былі заслуханы інфармацыі менскага і аршанскага акруговых саветаў фізкультуры.

— Зарадкавая гімнастыка,—кажа тав. Якубінак (Менск)—пачала праводзіцца в мінулага году ў саюзах: саўгандальслужачых, мэталістых і мэдсанпрацы.

У двухтыднёвік фізкультуры будзе ахоплена зарадкай 150 ч. на гарбарні «Бальшавік», 100 ч.—на шчотачнай ф-цы, і г. д.

Мяркуецца правесьці нараду гаспадарнікаў і абгаварыць на ёй пытаньне аб зарадцы на прадпрыемствах.

У Воршы зарадкавая гімнастыка на прадпрыемствах пачала праводзіцца таксама з мінулага году. Зарадкай займаецца 108 гарбароў, 20 друкароў, 30 швейнікаў. На калыскіх заводах зарадкай ахоплена 40 чалавек.

Дрэнна справа стаіць зарадкавай гімнастыкай на дуброўенскай фабрыцы, дзе працуе 800 чал. рабочых, а зарадкай ахоплена ўсяго 40-50 чал. Зарадкай займаюцца пераважна дарослыя рабочыя.

Нарада выказалася за шырокую папулярызацыю зарадкавай гімнастыкі.

Пошта і тэлеграф

— Каб з'эканоміць час і сродкі, Менская паштовая кантора парашыла наладзіць непасрэдную дастаўку карэспандэнцый і газэт усім дзяржаўным установам, а таксама забіраць ад усіх усю карэспандэнцыю, прызначаную для адпраўкі.

***

З 1-га ліпеня сельскія лістаносцы будуць дастаўляць пошту замест 2-х раз тры разы ў тыдзень.

***

Адкрыты новыя паштовыя агенцтвы на торфраспрацоўках «Цна» і «Белае балота» Менскай акругі, у доме адпачынку ў Ждановічах і ў лягерах «Чырвонае урочышча».

Гэтымі днямі адкрываецца паштовае агенцтва ў вёсцы Бышча, Барысаўскага раёну для абслугоўваньня рабочых цягелень.

***

На Менскай тэлефоннай станцыі ўстанаўляюцца тры камутатары, што дасьць магчымасьць уключыць яшчэ 300 абанэнтаў, 96 асоб даўно ўжо падалі заявы аб тым, каб устанавіць тэлефоны.

СУД

Настаўнік-антысэміт

Маеўскі Міхась, па прафэсіі настаўнік, працаваў у Слаўкаўскай школе, Глускага раёну, Бабруйскай акругі. Працуючы настаўнікам у савецкай школе, ён не знаходзіў лепшага «пэдагагічнага» мэтаду, каб супакоіць вучняў, як крычаць на іх: «што вы рагочаце, як жыды ў сынагозе».

Для свайго таварыша настаўніка гэтай-жа школы, Рыўкіна, Маеўскі не знаходзіў іншых слоў, яд «жыд», «жыдоўская морда», «жыда ніколі ні чым не задаволіш».

Калі аднойчы Рыўкін у канцылярыі Слаўкаўскага сельсавету чытаў позвы на яўрэйскай мове, Маеўскі ў прысутнасьці многіх сялян заявіў: «што ты за жыд, калі ня ўмеєш чытаць нажыдоўску».

Акрамя антысэміцкіх Маеўскі ўжываў яшчэ і іншыя «мэтады» навучаньня вучняў: так, ён ставіў іх у куток, біў рукой на галаве, ставіў на калені і г. д.

Бабруйскі акруговы суд два дні разглядаў гэтую справу. За скрыўленьне лініі сацыяльнага выхаваньня, за ўзбуджэньне нацыянальнай варожасьці суд прыгаварыў Маеўскага на тры гады зьняволеньня і забараніў яму займаць пасаду настаўніка на працягу 2-х гадоў пасьля адбыцьця пакаранньня.

Па амністыі ў адзнаку 10-цігодзьдзя існаваньня БССР тэрмін зьняволеньня скарочаны Маеўскаму на палову. Вярхоўны суд прыгавар зацьвердзіў.

Б.

За ўзброены разбой—расстрэл

У вёсцы Мохава, Лоеўскага раёну, Гомельскай акругі, жылі Грыб Рыгор—25 год і Лысенка Пётра—25 г. Доўгі час займаліся яны сельскай гаспадаркай. Гаспадаркі былі досыць буйныя, але Грыбу і Лысенку ня вельмі падабалася «капацца» у зямлі. Надумалі яны пашукаць сабе іншае больш лёгкае і прыбытковае працы.

Гэта «праца» ім так спадабалася, што за досыць кароткі тэрмін улетку 1928 году яны зрабілі 8 узброеных грабяжоў і адно забойства. Грабілі яны і нападалі на рабочых плытагонаў па р. Дняпро, забіраючы ў іх увесь харч, вопраткі і грошы. У часе аднаго з такіх узброеных нападаў яны забілі капітана баржы.

Бацькі ведалі пра «працу» сваіх сыноў і з удзячнасьцю прымалі і хавалі награбленыя імі рэчы.

15 чэрвеня выязная сэсія Гомельскага аксуду ў г. Рэчыцы прыгаварыла Грыба Рыгора і Лысенку Пятра да расстрэлу. Іх бацькі пазбаўлены волі на два гады кожны ўмоўна. Вярхоўны суд зацьвердзіў прыгавор.

Б.

ЗЬВЯЗДА

МЕНСК

На 7-мігадзінны рабочы дзень

Прэзыдыум ЦП саюзу харчавікоў намеціў рад прадпрыемстваў для пераводу ў бліжэйшы час на 7-мігадзінны рабочы дзень. Намечаны да пераводу дражджавыя заводы «Чырвоная Зара» і «Пралетары» ў Менску, „Вызваленая Праца“ ў Віцебску, махорачная фабрыка «Змычка» ў Віцебску, хлебазавод і малочны завод у Менску. На ўсіх гэтых прадпрыемствах працуе 850 чалавек.

Першыя крокі таварыскага суду

Таварыскі суд яўрэйскага дзяржаўнага тэатру заслухаў справу аб грубой зьнявазе артыстым Магілёўскім артысткі Вольнінай. Суд пастанавіў выключыць т. Магілёўскага на 6 месяцаў з членаў саюзу.

Здымкі фільму „Волат“

У Менск прыехала з Ленінградзкай фабрыкі Белдзяржкіно кіно-здымочная група на чале з рэжысэрам Коршам. Экспэдыцыя будзе здымаць кадры для фільму «Волат» паводле сцэнарыя Вольнага. Карціну здымае аператар Шлюгейт.

Сачэце за аблігацыямі

Кантора Дзярэўбанку камандыравала сваіх работнікаў у Бягомльскі, Койданаўскі і Заслаўскі раёны для праверкі аблігацый у насельніцтва, бо ёсьць выпадкі, калі трымальнікі ня ведаюць аб выйгрышах, якія прыпалі на іх аблігацыі. Выяўлен рад аблігацый, на якія прыпалі выйгрышы.

Прыезд тэатру „Станок“

„Посрэдрабіс“ запрасіў для гастроляў у часе сьвяткаваньня 9-й гадавіны вызваленьня Беларусі ад белапалякаў ленінградзкі тэатр «Станок». У рэпэртуары тэатру—вечары сучаснага вадэвілю.

Новыя вылучэнцы ў савецкі апарат

ЦП саюзу харчавікоў пастанавіла камандыраваць на курсы вылучэнцаў 5 рабочых з хлебазаводу, заводаў „Чырвоная Зара“, „Пралетары“ і бойні.

На барацьбу з тыфусам

За апошні час эпідэмія тыфусу па БССР пачала зьмяншацца. Эпідэмія яшчэ не ліквідавана толькі ў некаторых раёнах: Рагачэўскім і Глускім, Бабруйскай акругі, Шклоўскім і Чавускім, Магілёўскай акр.

Для барьбы з тыфусам у найбольш заражаных раёнах арганізаваны спэцыяльныя перасовачныя эпідэмічныя атрады, якія павінны вылавіць колькасьць хворых, даць ім непасрэдную дапамогу, а таксама ізаляваць хворых. У вёсках атрады будуць рабіць дызэнфэкцыю памяшканьняў і вопраткі.

КІНО

„Поташ і Пэрлямутр“ (Кіно-сад «Чырвоная Зорка»)

Гэта новая амэрыканская пастаноўка в жыцьця амэрыканскіх яўрэяў рэкламуецца, як вясёлая камэдыя. Што да вясёласьці, дык яе ў фільме ня многа.

Фільм нельга ацаніць удалу. Трэба казаць пра яго пасобныя часткі.

Першая частка праўдзіва-рэалістычна і выклікае ў глядача пагардлівасьць да таго сьвету грошай і мяшчанства, у якім жыве яўрэйская буржуазія ў Амэрыцы.

Іншае трэба сказаць пра другую частку. Занадта сантыментальна і непраўдзіва выглядае такі гэст, як страта 30.000 даляраў і ўсяго прадпрыемства з-за абароны нейкага там бедняка Гарольда які,ахоўваючы гаспадарскае дабро, упаў у бяду: ён быў западзроны ў забойстве аднаго з бандытаў, якія імкнуліся абкрасьці магазын...

Гэта ёсьць уступка норавам амэрыканскае буржуазіі, якая з лёгкім сэрцам патапіла-б у ложцы вады кожнага, хто пагражае яе дабрабыту, але не хацела-б бачыць свой сапраўдны твар на экране...

Ня лепш і паліцэйскія. Яны—шчырыя законьнікі. Справядлівасьць для іх—вышэй за ўсё. І гэтак мелецца амэрыканская юстыцыя, законнасьць у той час, калі косьці Сако і Ванцэці не пасьпелі яшчэ згнісьці ў зямлі...

Бязумоўна, рэжысэр Фрыц Морыс справіўся са сваёю задачаю для буржуазіі, але для нашага глядача патрэбна было-б умяшанье нашага мантажора.

В.

Кіно-фільм аб жыцьці палякаў у БССР

Белдзяржкіно робіць здымкі кінокарціны, якая малюе жыцьцё і быт працоўных палякаў у БССР. Здымаюцца польскія калгасы, сельсаветы, клюбы, школы, пэдтэхнікумы, дзіцячыя дамы, выбары дэлегатаў на зьезд працоўных палякаў.

Будзе таксама засьняты для кіно ўсебеларускі зьезд працоўных палякаў.

Прыезд украінскіх фізкультурнікаў

Да дня сьвяткаваньня 9-ае гадавіны вызваленьня Беларусі ад белапалякаў у Менск прыяжджае каманда украінскіх фізкультурнікаў у складзе 35 чалавек. Каманда прабудзе ў Менску 3 дні, пасьля чаго на 2 тыдні выедзе ў акругі Беларусі.

Вапнаваньне 5.000 гэктараў зямлі

На сёнешні дзень, на адрас пунктаў па вапнаваньні ўжо адгружаны 34 драбілкі і 35 рувакіёў. Да 15-га ліпеня на вапнавальныя пункты будзе дастаўлена яшчэ 30 драбілак. У бягучым годзе ў часе асеньняй сяўбы будзе заваплавана 5.000 гэктараў зямлі.

„ЗЬВЯЗДА“ ДАПАМАГЛА

ЗА БЕЗГАСПАДАРЧАСЬЦЬ ЗЬНЯТ З ПРАЦЫ

Мен. АКК паведамляе, што па дасланай заметцы пад назвай «Аб фатаграфу Сосінаву», дзе пісалася аб раздутасьці штату ў працкалектывае фатаграфаў, адсутнасьці працдысцыпліны, стратнасьці і неэтычных адносінах да супрацоўнікаў, зроблена расьсьледваньне. Факты пацьвердзіліся і згодна пастановы фракцыі ЦП саюзу Сосінаў зьняты з працы.

ЗА ГАНЕНЬНЕ НА СЕЛЬКОРА

Па заметцы ў газэце «Зьвязда» ад 18/I 29 г. за № 14 аб ганеньні на селькора Жукоўскага з боку сакратара Слабадзкой яч. КП(б)Б Дроніка і старшыні Слабадзкога сельсавету Гнядзько, Мазырская АКК паведамляе, што факты расьсьледваньнем устаноўлены. Пастаўлена пытаньне перад Мазырскім АК КП(б)Б аб зьняцьці Дроніка з работы сакратара парт'ячэйкі і пацьвердзіць пастанову Калінкавіцкага РК КП(б)Б аб зьняцьці Гнядзько з пасады старшыні сельсавету.

ПАСТАЎЛЕНА НА ВІД

Бярэзінскім РК КП(б)Б пастаўлена на від сакратару РВК Белахвосьціку за атрыманьне звыш нормы трох пудоў мукі і члену праўленьня спажыв. таварыства Шукану за выдачу мукі Белахвосьціку.

Факты аб спэкуляцыі Белахвосьціка расьсьледваньнем не ўстаноўлены.

«КАЛІ НЯМА ГАРЭЛКІ — ПАДАВАЙ САМАГОН»

Аб'езчык Скарубскі з 1 мая зьняты з працы за п'янства і злоўжываньне. Расьсьледваньнем райкамісіі РСІ па дасланай заметцы газ. «Зьвязда» «Гарэлкі, а калі няма гарэлкі, то даёш і самагон» факты пацьвердзіліся і справа аб ім перададзена сьледчым органам.

П'ЯНЫ ЛЯСЬНІК

Ленінскім лясьніцтвам Менскай акругі звольнены з працы з 1-га чэрвеня лясьнік Барысёнак за п'янства і нядобрасумленныя адносіны да службовых абавязкаў, згодна паведамленьня інспэктарыяту лясоў па дасланым лісьце газ. «Зьвязда».

АНТЫСЭМІТЫЗМ У СЯМІГОДЦЫ ПРАЦЫВІТАЕ

Пастановай фракцыі акрпраўленьня саюзу працасьветы загадчык Любоніцкай сямігодкі Бабарэка зьнят з працы і пераведзен у другі раён за недастаткове рэагаваньне з яго боку на выпадкі антысэмітызму ў сямігодцы. Фактаў антысэміцкіх выпадкаў з боку самога Бабарэкі па матар'ялах высьветлена мала.

Воз на старым месцы

2 гады газ. «Зьвязда» паказвала гарсавету, што Татарскі раён п'е бруд, што дзякуючы суседзтву з агародамі, куды звозіцца з усяго гораду сьмецьце, раён не застрахаваны ад эпідэмій. Гарсавет даў загад паставіць вадаразборную будку толькі пасьля таго, як справа дайшла да РСІ.

У першых лічбах чэрвеня на рагу Малой і Вялікай Татарскіх вуліц прыступілі да работы, але... побач два дамы млынара-кулака, яму, бачыце нязручна, што крант будзе на яго зямлі: трэба падмятаць дый наогул народ—не падабаецца кулачку—і пачалі капаць трубу на другім баку, не па пляне.

Рабочае насельніцтва абрадавалася. Насельніцтву ўсё роўна: па пляне ці бяз пляну дадуць яму чыстую ваду. Аднак, прыехаў «старшы» і работу прыпыніў. 27-га чэрвеня труба лопнула, вада цякла раўчаком гадзін 4. Пасьля гэтага забілі трубу, закапалі і яму.

І ваколіца зноў у надзеі на чыстую ваду!

Кулак-млынар ня хоча!

Дзядзька А.

Паведамленьні Сьпіс

дакладчыкаў, вылучаных кастрычнікавым райкомам КП(б)Б да «Міжнароднага дня каапэрацыі»:

Дубіна, Сьмірноў, Вайлюс, Тумас, Пыжыкаў, Швэйдаў, Лібман, Матусевіч, Койліг, Савіцкі. Зісман, Кац, Стракоўскі, Сасноўскі, Рудзіцкі, Розэмблюм, Барсукоў, Алесін, Кандрашук, Крэмер, Кроль, Камэнштэйн, Брыскін, Багарад, Цырлін, Кумкес, Хаскін, Кац, Альпяровіч, Віпрынская, Яршоў, Фрыд, Лазоўскі, Пасюкевіч і Лазінскі.

ДАДЛАДЧЫКІ АБ М. Д. КААП.

— Для правядзеньня дакладаў на прадпрыемствах «Аб міжнародным дні каапэрацыі» на 4, 5 і 6 ліпеня г. г., Фрунзэўскім райкомам КП(б)Б вылучаюцца наступныя т. т. 1) Платун, 2) Ярмакоў, 3) Макарэвіч, 4) Чапядзінскі, 5) Ліўшыц, 6) Калмык, 7) Кучынскі, 8) Табайнік, 9) Фрыдман, 10) Баліцкі, 11) Слонім, 12) Вайнэр, 13) Шукевіч-Трацьцякоў, 14) Масюкоў, 15) Аўчыньнікаў, 16) Адамовіч, 17) Філатаў, 18) Прафэрансаў, 19) Рабіновіч, 20) Літвіновіч, 21) Дукшт, 22) Дзічкоўскі, 23) Розін (ЦСПСБ), 24) Гравіт, 25) Гурскі.

У акругкоме МОПР'у

Сёньня, ў сераду, 3 ліпеня, а 7 гадз. увечары ў памяшк. АК МОПР'у адбудзецца пашыранае пасяджэньне менакругкома МОПР'у.

Парадак дня:

1. Замацаваньне пляна ўдзелу МОПР'у ў міжнародным чырвоным дні—1 жніўня, 2. Замацав. пляна удзелу МОПР'у ў дзень вызваленьня Беларусі ад белапалякаў. 3. Інфарм. Барыс. РК аб ходзе збора на карысьць берлінскіх рабочых, 4. Аб экскурсіі, 5. Бягучыя справы.

Яўка ўсіх членаў і кандыдатаў акругкому, якія знаходзяцца ў Менску—абавязкова.

Запрашаецца мопраўскі актыў.

АК МОПР'у.

— У чацьвер, 4-VII, а 7-й гадз. увечары ў садзе харчавікоў склікаецца раённы сход членаў МОПР'у Фрунзэўскага раёну.

У парадку дня даклад аб міжнародным становішчы і задачах МОПР'у (дакладч. т. Слонім). Пасьля сходу—кіно.

Уваход па мопраўскіх і саюзных білетах.

— Кастрычнікавы райком МОПР'у паведамляе, што 4-га ліпеня ў чацьвер адбудзецца нарада агітсакцыі. Вылучаным таварышом абавязкова зьявіцца а 7 гадзіне ўвечары ў Кастрыч. райком (рог Урыцкага і К. Маркса).

— ДОМ АСЬВЕТЫ. Сёньня 3-VII—роўна а 7 з пал. гадз. увечары адбудзецца агульны сход асьветнікаў гор. Менску разам з курсантамі настаўніцкіх курсаў з наступным парадкам дня: даклад т. Мазура аб пачатку і канцу навуч. году і перапынках у школах.

У чацьвер 4-VII а 7 гадзіне адбудзецца адчынены сход ячэйкі КП(б)Б мэдфаку БДУ у памяшканьні нэрвовай клінікі.

— У пятніцу 5-га ліпеня г. г. роўна а 7-й гадз. увечары, у памяшканьні мэдфаку БДУ у 31 пакоі (Земляробскі завул. № 4) скліканецца агульны сход студэнтаў Вяч. раб. Унів-ту, якія жадаюць перавесьцісь на 1929-30 навуч. год у іншыя ВНУ Беларусі.

ПАПРАУКА

У № 137 «Зьвязды» ад 19-га чэрвеня 1929 г. у артыкуле «Жывыя тормазы ў апараце ЦСУ» паведамлялася, што тав. Смарадзінская была вычышчана з ЦСУ, як бюракрат і антысавецкі элемэнт.

Паводле даведкі інспэктара НК РСІ Беларусі па чыстцы савецкага апарату, тав. Смарадзінская сапраўды была зволена з работы ў ЦСУ ў сувязі з скарачэньнем апарату.

Адказны рэдактар ЯН. АСЬМОЎ

НАВУКА І ТЭХНІКА

АЎТА-ВУЛІЦА НАД ЧЫГУНКАЙ

Вялікая гушчыня чыгунак і аўтамабільных дарог, якія ідуць да Лёндану выклікала цікавы праект, які вырашае ўсе нязручнасьці і небясьпекі заблытанай сеткі пад'язных шляхоў. Над чыгункамі, на магутных жалезных перакрыцьцях праект прапануе наладзіць бэтонныя аўтамабільныя дарогі, якія на поўнай адлегласьці за гарадам злучаюцца з існуючымі аўтамабільнымі шасэ. Гэты праект ангельскіх інжынэраў быў ухвалены ў амэрыканскім друку.

ЛЁКАМАТЫЎ, ЯКІ ВЯДЗЕ ЦЯГНІК ДАЎЖЫНЁЮ Ў ТРЫ КІЛЁМЭТРЫ

Тэхніка паравоза будаўніцтва ідзе наперад гіганцкімі крокамі. У Амэрыцы нядаўна пабудаваны лёкаматыў-волат. Гэты буйнейшы ў сьвеце лёкаматыў мае магутнасьць у 6.000 конскіх сіл. Агульны лік колаў—тут 22. Даўжыня лёкаматыву з тэндэрам—больш 40 мэтраў. Вага яго—550 тон. За гадзіну работы гэты лёкаматыў спальвае 20 тон вугалю, г. зн. прыкладна столькі-ж, колькі патрэбна для ацяпленьня двух дамоў сярэдняй велічыні на працягу цэлай зімы. Па роўнай дарозе ён можа везьці цягнік даўжынёю ў 3 кілёмэтры.

ТАНКІ—РУЙНАВАЛЬНІКІ БУДЫНКАЎ

Цікавыя досьледы работы вусенічных танкаў былі зроблены нядаўна ў амэрыканскай арміі, паблізу г. Вашынгтону. Групе танкаў даручана было зруйнаваць акружаныя дротавымі загражэньнямі драўляныя пабудовы. Частакол з калючым дротам быў зьнішчаны ў момант. Пасьля гэтага танкі пайшлі ў простую атаку на сьцены будынку. Як перадаюць сьведкі гэтых досьледаў, трэскі ад паламаных дошак, пыл ад атынкоўкі, газы матораў—усё зьмяшалася ў шэры туман. У кароткі тэрмін будынкі былі палкам зруйнаваны.

ВЯЛІКІЯ ВЫРАТОЎЧЫЯ ШЛЮПКІ

На найноўшых акіянскіх пасажырскіх параходах тыпу «Брэмэн» ужыты выратоўчыя шлюпкі новай сыстэмы вельмі буйных разьмераў. Гэтыя шлюпкі маюць у даўжыню 11,5 мэтраў пры шырыні ў 4,10 м. і могуць зьмясьціць кожная 145 чалавек. Такія вялікія лодкі прызнаны больш мэтазгоднымі па наступных меркаваньнях. Меншых лодак для тае-ж агульнае колькасьці людзей, якая дасягае на параходах тыпу «Брэмэн» 3.000 чалавек, патрэбна было-б вельмі многа. Між тым, у часе крушэньня вельмі цяжка сачыць за правільнасьцю спуску такой вялікай колькасьці шлюпак, няправільнасьць-жа работы, якая адбываецца без адпаведнага кіраўніцтва, цягне за сабою пагібель шлюпак. Акрамя таго, невялікая колькасьць буйных шлюпак можа быць спушчана на ваду значна шпарчэй, чым мноства дробных, з якіх яны загароджваюць шлях спуску іншым, і часта нават стаяць адна на другой.

ШПАРКАХОДНЫ АМЭРЫКАНСКІ ТАНК

У Амэрыцы блізка ля Бальціморы нядаўна былі выпрабаваны новыя танкі, якія зьяўляюцца ў сучасны момант аднымі з самых шпаркаходных у сьвеце. Хуткасьць гэтых танкаў дасягае на роўным месцы 32 км. у гадзіну.

Для прахаджэньня балотнай мясцовасьці, дробных рэчак і розных няроўнасьцяй танкі забясьпечаны новым тыпам вусеніц, якія даюць ім магчымасьць ісьці, ня гледзячы на перашкоды, з досьць вялікай хуткасьцю. Пры выпрабаваньні адзін з такіх танкаў пакрыў адлегласьць у 2.400 км. У часе выпрабаваньня было высьветлена, што танк добра забірае крутыя пад'ёмы з кутом ухілу да 45°.

Узбраеньне танка складае адзін кулямёт. Корпус танка разьмешчаны вельмі нізка з мэтаю даць як мага меншую пэль для варожага агню.

Прафком мэдфаку БДУ з жалем паведамляе ўсіх студэнтаў мэдфаку, родных і знаёмых аб сьмерці студэнта III курсу

т. ВАЙЦІНКОВА Карнілія Карпава.

Пахаваньне адбудзецца 4 ліпеня а 12 гадзіне дня. Вынас цела з I савецкай больніцы.

ТЭАТР, КІНО

Тэатр „ПРАФІНТЭРН“

Серада, 3 ліпеня — 2-я гастроль Маскоўскага Тэатру Пролеткульта для членаў прафсаюзаў

„ПО ТУ СТОРОНУ ЩЕЛИ“

Астача білетаў у раб. каса і ў касе тэатру „Прафінтэрн“ Пач. роўна а 9 гадз.

КІНО-ТЭАТР „Культура“ — Прем'ера вытворчасьць Белдзяржкіно 1929 г. „ХВОІ ГАМОНЯЦЬ“ драма у 7 ч. Пачатак 1-га сэансу в 7 з пал. гадзін. Каса—ад 6 г.

Кіно-сад ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА Савецкая, 71. — Вялікая мастацкая пастаноўка МЕСЯЦ ЗЬЛЕВА па аднайменнай п'есе Біль-Белацэрковскага. 2 сэансы: пачатак 1-га а 9 г. 15 м., 2-га а 10 г. 45 м.

КІНО Інтэрвацыяна — 2 баявіка—12 частак у кожны сэанс 2 1. ШЛЮБ пад ЗАКЛАД у 6 част. 2. УНУЧАК БАБКІ кам. у 6 част. з удзел. Гарольд Лёйд. Пачатак а 7 гадз. Каса—ад 5 з пал. гадз.

КІНО Пралетары — 2 баявікі ў адзін сэанс Чалавек з кіно-апаратам у 6 част. Гарольд Лёйд у арыгінальнай камэдыі ЛУІ У РАІ у 3-х частк. Пачатак—а 8 гадз. Каса—ад 6 гадз.

КІНО СпартаК — Выдатны амэрыканскі кіно-фільм Рабы акіяну мастацкая драма ў 7 част. Каса адкрыта ад 6 гадзін. Пачатак сэансаў а 7 г. 30 м.

ХТО ЯШЧЭ НЕ ПАДПІСАЎСЯ на газ. „ЗЬВЯЗДА“ з 1-га ЛІПЕНЯ, ПАСЬПЯШЭЦЕСЯ З ПАДПІСКАЙ.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў гал. канторы газ. «ЗЬВЯЗДА» —Савецкая 63, 3-ці паверх, з 9-ці гадз. ран. да 5 гадз. дня.

АДПУСКНІКІ!

НЕ ЗАБУДЗЬЦЕСЯ ПЕРАД АДЫХОДАМ — У ВОДПУСК ПАВЕДАМІЦЬ У — кантору газэты „ЗЬВЯЗДА“ Савецкая, 63 тэл. 7-81

ВАШ НОВЫ АДРАС

Вам будзе пасылацца «ЗЬВЯЗДА» па месцы знаходжаньня ў водпуску

без асобнай даплаты за перамену адрасу.

СЁНЬНЯ, серада 3 ліпеня

ДЗЯРЖЦЫРК

ПЕРШЫ РАЗ У БССР

Першая гастроль лепшага расійскага муштравальніка Уладзімера ДУРАВА (маладшага)

Пляменьніка трагічна загінаўшага Анатолія Анатоліевіча ДУРАВА.

СУСЬВЕТНАЯ МУШТРОЎКА СОН ПАЛЯЎНІЧАГА ГАЛУБЫ-АРТЫСТЫЯ

БОКС паміж чапавекам і спавутым баксерам аўстралійскім КЕНГУРУ, бокс будзе праводзіцца на манежы цырку.

ШЭДЭЎР МУШТРОЎКІ ПЕРШЫЯ У СЬВЕЦЕ СЛАВУТЫЯ МОРСКІЯ ЛЬВЫ ВЕРА, ЛЮБА, ЛОТОС.

ЛЬВЫ музыкі, жанглеры, футбалістыя, акрабаты.

Выключная муштроўка САБАКІ жакеі акрабаты. Рэдкія экзэмпляры МАЛПЫ дрот, баланс, канатаходцы.

Удзел прымае ўся трупа. З прычыны гранд- праграмы, пачатак а 9 гадз. увечары.

КРЭМ МЕТАМОРФОЗ ВЕСНУШЕК, КРАСНОТЫ, ЖЕЛТЫХ ПЯТЕЙ, ЗАГАРА, УГРЕЙ И ДР. НЕДОСТАТКОВ КОЖИ ЛИЦА.

ЛУЧШЕЕ ИСПЫТАННОЕ СРЕДСТВО ПРОТИВ

Coty Paris КАЗИМИР

Не спажывайце алькагольных напіткаў, шкодных для здароўя.

ПЕЦЕ толькі КАУКАСКІЯ НАРЗАН Натуральныя Мінэральныя Воды

ЭСЕНТУКІ № 20 Адзіныя сталовыя воды з натуральнай вуглякіслатой.

ЭСЕНТУКІ № 4, № 17, № 18 | БАТАЛІНСКАЯ СЬМІРНОЎСКАЯ СЛАВЯНАЎСКАЯ | БАРЖОМ

Са складу 25 % адпускаюцца па гуртавых цэнах з дармовай дастаўкай на дом.

Заказы вагонамі прымаюцца па зьніжаных цэнах і асобна ільготных умовах.

Патрабуйце ўсюды паўкаскія натуральныя мінэральныя воды!

Нарзан з кіёскаў прадаецца шклянкамі.

Раённы склад Белмэдгандлю: Менск, рог Савецкай і Энгельса 26-92, тэл. 374.

НАРЗАН — ЭСЕНТУКІ № 20.

Прыймо абвестак у чарговы нумар газэты адбываецца да 2-ое гадзіны дня

Кошт публікацыі 50 к. аб згубе дакумэнту

ЗЬВЯЗДА

ФОТО-ЦЫНКАГРАФІЯ ПРЫМАЕ ЗАКАЗЫ

НА КЛІШЭ

МАСТАЦКАЕ ВЫКАНАНЬНЕ РЫСУНКАЎ.

З ЗАКАЗАМІ = ЗВАРОЧВАЦЦА У ГАЛОЎНУЮ КАНТОРУ ГАЗЭТЫ „ЗЬВЯЗДА“-МЕНСК, САВЕЦКАЯ, №63, 3-ЦІ ПАВЕРХ.

ПАРТРЭТЫ, ГРАВЮРЫ, ПЛЯНЫ, СХЭМЫ, ФАКСІМІЛЕ, ЭТЫКЭТЫ, ЦЭНЬНІКІ, ВОКЛАДКІ, ВІНЬЕТКІ, РЭКЛЯМНЫЯ ПЛЯКАТЫ І ІНШЫЯ МАСТАЦКІЯ РАБОТЫ.

ЛЯЧЭБНІЦА — МЕНСКАГА ЯЎРЭЙСКАГА — МЭДЫЧНА-САНІТАРНАГА Т-ВА

Ленінск., побач з 2-м Домам Савецтаў, № 25, тэл. 12-66

АДКРЫТА ад 3 гадз. дня да 9 гадз. увеч.

Прыём па ўсіх спэцыяльнасьцях: унутран., хірургічн., жаночыя, зубныя, аваробы вока, нэрвы, хваробы вуха, горла і носа і хваробы скуры

ФІЗІЯТРЫЧНЫ ГАБІНЭТ кварц, электра і сьвета лячэньне

РЭНТГЕНАЎСКІ ГАБІНЭТ робіць здымкі, прасьвечваньне і лячэньне хворых. Прыём хэміка бактэрыялёгічных аналізаў.

КАНСУЛЬТАЦЫЯ ПРАФЭСАРОЎ

Прымаюць па папярэднім запісе

Па хвар. вуха, горла і носа—праф. Бурак па пятніцах ад 3-х гадз.
Па вэнэрычных — —праф. Кроль па чацьвярох ад 6 гадз.
Па кішэчна-страўн. — —дацэнт Монасзон па аўторках ад 8 гадз